

Пытанне намесніку міністра ЖКГ: ці можна абсталяваць кватэры індывідуальнымі прыборамі ўліку цяпла па такім жа прынцыпе, як калісьці зрабілі з прыборамі ўліку вады?

СТАР. 2



У Мінск з Германіі на выставу «Францыск Скарына: вяртанне на радзіму» прывезлі ўнікальны старажытны канвалют, які ўключае 11 прыжыццёвых выданняў Бібліі Скарыны.

СТАР. 6



За першыя 8 месяцаў гэтага года ў Літве нарадзілася 23,1 тыс. дзяцей, або на 2 працэнты менш, чым за той жа перыяд мінулага. Чаму літоўскія жанчыны не хочуць нараджаць?..

СТАР. 7


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 КАСТРЫЧНІКА 2012 г. СУБОТА № 194 (27309) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯДОЎНА ПРЫТРЫМЛІВАЕЦЦА ЗБАЛАНСАВАНАГА І МІРАЛЮБІВАГА КУРСУ Ў ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ

**Беларусь паслядоўна прытрымліваецца збалансаванага і міралюбівага курсу ў знешняй палітыцы і гатова да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з усімі краінамі свету без выключэння. Аб гэтым 5 кастрычніка заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы даверчыя граматы паслоў замежных краін.**

Даверчыя граматы Прэзідэнту Беларусі ўручылі паслы Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, Венгрыі, В'етнама, Германіі, Грузіі, Зімбабвэ, Інданезіі, Казахстана, Літвы, Суверэннага Ваеннага Мальтыйскага Ордэна, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў і Туркменістана.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларусаў адрознівае адкрытасць, добрасардэчнасць, спагадлівасць, гасціннасць і міралюбнасць. Менавіта гэтыя якасці пакладзены ў аснову знешнепалітычнай дактрыны краіны. «Наша асноўнае крэда ва ўзаемаадносінах з замежнымі партнёрамі — раўнапраўны і ўзаемапаважлівы дыялог», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы не прымаем націску і ўмяшання ва ўнутраныя справы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, асабліва звярнуўшы на гэта ўвагу кіраўнікоў дыпмісій краін Еўрасаюза.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, сёння еўрапейская эканоміка сутыкнулася з сур'ёзнымі выклікамі. Можна пачуць нават меркаванні аб пагрозах цэласнасці Еўрапейскага саюза. «У гэтых умовах як ніколі важна аб'яднанне намаганняў краін усяго кантынента для барацьбы з фінансава-эканамічнымі цяжкасцямі, а таксама новымі трансгранічнымі праблемамі, — лічыць Прэзідэнт Беларусі. — І ўсе неабыякавыя і разважлівыя людзі гэта разумеюць, як і тое, што па суседстве з Еўрасаюзам дынамічна развіваецца канструктыўна настроены еўразійскі інтэграцыйны праект».

«У гэтай сітуацыі здзіўляе тая ўшчэрбнасць і тэндэнцыйнасць, з якой асобныя дзеячы ў Бруселі, якія, дарэчы, усё больш адрываюцца ад рэальных патрэб еўрапейскіх народаў, ацэньваюць падзеі ў нашай краіне», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Ментарскі тон і нібыта адзіна правільны заходні светапогляд колькі хочаце могуць навязвацца краінам, якія бачаць сябе ў будучым часткай Еўрасаюза. Але гэта не ў дачыненні да Беларусі, — падкрэсліў Прэзідэнт. — На шляху эвалюцыйных пераўтварэнняў, або, калі хочаце, мадэрнізацыі палітычнай і эканамічнай сістэмы, у інтарэсах нашага народа мы не будзем дзейнічаць па нечай указцы звонку».

«У той жа час мы адзіныя з еўрапейцамі ў разуменні канчатковай мэты нашых рэформ: умацаванне пазіцый Беларусі як сучаснай, адказнай, дэмакратычнай еўрапейскай дзяржавы. У нашым характары заўсёды адказваць узаемнасцю на добрыя і паважлівыя адносіны», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Мы чакаем, што Еўрасаюз адмовіцца ад бессэнсоўнага націску на нашу краіну, зробіць захады для аднаўлення даверу да сябе як да сур'ёзнага партнёра і добрага суседа. І роля ў гэтым працэсе кіраўнікоў дыпмісій краін — членаў ЕС істотная», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт асабліва падкрэсліў, што Беларусь з'яўляецца неад'емнай часткай сучаснай вялікай Еўропы: «І мы падзяляем агульную адказнасць за яе будучыню, гатовыя актыўна ўзаемадзейнічаць з еўрапейскімі дзяржавамі ў інтарэсах працвітання і бяспекі ўсяго кантынента».

Звяртаючыся да дыпламатаў з краін Еўрасаюза, і ў прыватнасці да пасла Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Бруса Бакнела, кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў: «Мы гатовы, калі вы да гэтага гатовы, з вамі супрацоўнічаць. Думаю, пара нам ужо адмовіцца ад гэтых стэрэатыпаў і стандартных абвінавачванняў з боку Еўрасаюза ў адрас Беларусі. Час ужо шукаць агульныя інтарэсы, я думаю — гэта галоўнае».

У той жа час у кароткай гутарцы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Літвы Лінасам Лінкявічусам Прэзідэнт Беларусі выказаў упэўненасць, што бакі справяцца з усімі праблемамі. «Думаю, нам нікуды не дзецца ад нашага супрацоўніцтва», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для Беларусі па-ранейшаму важнейшае значэнне мае ўмацаванне ўзаемавыгадных сувязяў на постсавецкай прасторы.

СТАР. 2

■ Шчасце, калі ў доме Гаспадар

## Яблычна-вішнёвы курорт Чабатароў,

### або Як вырошчванне садавіны і ягады зрабіць прыбытковым бізнэсам?

**Прадпрымальныя Віктар і Надзея Чабатары заўсёды лічылі фермерства справай сямейнай. Таму і дзяцей сваіх змалку настройвалі на тое, што пасля заканчэння ўніверсітэтаў трэба вяртацца на малую радзіму. І што вы думаеце — вярнуліся. Сын Віктар працуе ў бацькоўскай гаспадарцы аграномам, дачка Вікторыя — эканамістам-менеджарам.**

### «ПАЧЫНАЛАСЯ ЎСЁ З... ПАМІДОРАЎ»

«Акрамя ўборкі, да 10 кастрычніка ні пра што не магу думаць», — выпаліў яшчэ па тэлефоне галоўны інжынер (кіраўнік — жонка) адной з самых вялікіх у Беларусі сялянскіх гаспадарак «Антэй-сад» Віктар Чабатар. Але на сустрэчу ўсё ж такі згадзіўся. Калі ж сустрэліся, без лішніх слоў павёз на агледзіны ўладанняў.

— Вось гэта малады сад, — прыпыняе машыну на ўзбочыне. — З яго ўжо зняты яблыкі. Ажно 32 скрыні з 7 гектараў. Я і яшчэ 4 чалавекі прайшлі, каб сабраць тыя яблыкі, прыкладна па 3 кіламетры кожны. Як ні круці, але, каб пастаянна мець добры ўраджай, трэба садзіць і садзіць сады.

Праязджаем далей. Такое адчуванне, што трапляем у яблычны рай. Куды ні кінь вокам — паўсюдна дрэвы, усыпаныя крамянымі яблыкамі. Фермер заглушае матор, выходзіць з машыны і накіроўваецца да самай прыгожай яблыні.

— Гэта «Антэй», частуйцеся *(працягвае мне толькі што сарваны апетытны яблык)*. Дарэчы, адзін з маіх самых любімых гатункаў. Мы нават сваю гаспадарку ў гонар яго назвалі. У свой час гэта быў вельмі папулярны ў Беларусі гатунак. Цяпер яго звялі. І вельмі дарэмна. Мы адны з нямногіх, хто яго вырошчвае.

Вырошчваюць фермеры з Восава не толькі беларускія гатункі яблыкаў (хоць іх пераважная большасць), але і гатункі польскай, канадскай, рускай селекцыі. Праўда, як высветлілася, пачыналася ўсё зусім не з яблынь...

— Пасля ўніверсітэта я зрабіў дома дзве цяпліцы: адна была з памідорамі, другая — з агуркамі. Калі ажаніўся, гэтыя цяпліцы падзялілі. Я даглядаў за памідорамі, жонка — за агуркамі. Вынікі былі ашаламляльныя: мы проста не ведалі, куды тыя агуркі і памідоры падзець.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

**Педагагічным работнікам Рэспублікі Беларусь**

**ДАРАГІЯ СЯБРЫ!**

**Сардэчна віншую вас з прафесійным святам — Днём настаўніка.**

***Праца педагога — адна з самых важных і высакародных на Зямлі. Яе вынікі ў многім вызначаюць ход гісторыі і ўплываюць на лёсы пакаленняў. Місія настаўніка заключаецца не толькі ў перадачы ведаў, а перш за ўсё — у фарміраванні асобы вучня, выхаванні годных грамадзян і патрыётаў Айчыны.***

***Уражвальныя поспехі Рэспублікі Беларусь у прасоўванні па шляху сацыяльна-эканамічнага і навукова-тэхнічнага прагрэсу дасягнутыя ў многім дзякуючы высокай якасці айчыннай адукацыі. Таму першачарговымі задачамі з'яўляюцца захаванне і абагачэнне традыцый беларускай школы, стварэнне ўмоў для яе стабільнага развіцця, павышэнне прэстыжу педагагічнай дзейнасці.***

***Мы паважаем і цэнім настаўнікаў як надзейную апору дзяржавы, нашых верных памочнікаў у вырашэнні галоўных пытанняў грамадскага жыцця. Перакананы, што вы і надалей будзеце працаваць гэтак жа плённа, укладваючы свае сілы, розум і талент у станаўленне новых пакаленняў незалежнай Беларусі.***

***Зычу настаўнікам і ўсім педагагічным работнікам нашай краіны моцнага здароўя, поспехаў, шчасця і добрага настрою.***

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

■ Заўтра — Дзень настаўніка

## ЛЕПШАЕ ВОСЕНЬСКАЕ СВЯТА



**Некалі 18-гадовая студэнтка Юлія Бялова прыйшла ў сталічную школу № 99 на практыку. І засталася тут надоўга... Вось ужо чатырнаццаць гадоў Юлія Валянцінаўна працуе настаўніцай пачатковых класаў, кожны дзень вучыць сваіх гарэзлівых дзетак не толькі чытаць і пісаць, але і станавіцца сапраўднымі людзьмі — сумленнымі, справядлівымі.**

— Кажуць, што жыццё дае чалавеку тры радасці: сяброў, каханне і працу. Мне жыццё падарыла любімую працу, якая прымушае мысліць творча і нестандартна. Не буду ўтойваць, што кожны раз радуюся, калі мой 3 «А» бяжыць да мяне насустрач, кожны вучань хоча прайсціся са мной за руку, — усміхаецца Юлія Бялова. — Для мяне яны ўсе — мае дзеці, а іх праблемы — мае праблемы. Для настаўніка вельмі важна, каб яго помнілі, хоць зрэдку заходзілі ў госці ці тэлефанавалі...

Дарэчы, Юлія Бялова з'яўляецца ўладальніцай ганаровага звання «Мінчанін года—2011», высокага тытулу «Настаўнік года», якое яна атрымала па выніках сталічнага конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў, і фіналісткай рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года—2011».

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**

Сяргей МАСКЕВІЧ:

## «НАСТАЎНІК — ПРАФЕСІЯ АД БОГА»

**7 кастрычніка беларускія педагогі адзначаць сваё прафесійнае свята. Напярэдадні Дня настаўніка мы сустрэліся з міністрам адукацыі Сяргеем МАСКЕВІЧАМ, каб абмеркаваць пытанні, якія сёння ва ўсіх на слыху. Чаму для таго, каб палепшыць якасць ведаў школьнікаў па дакладных навуках, трэба падаўжаць навучальны год? Наколькі апраўдала сябе гімназічная адукацыя? Што новага з'явіцца ў Палажэнні аб атэстацыі педагагічных работнікаў? Як адаб'ецца на становішчы настаўнікаў эксперымент па фінансаванні, які стартуе 1 студзеня 2013 года?**



### Пра Кодэкс аб адукацыі...

**— Сяргей Аляксандравіч, з 1 верасня 2011 года адукацыйная галіна жыве, кіруючыся Кодэксам аб адукацыі. Што паказаў мінулы год? Ці выявіліся ўжо ў працэсе штодзённай работы педагогаў праблемныя пытанні, якія патрабуюць карэкціроўкі на заканадаўчым узроўні?**

— Работа над Кодэксам вялася яшчэ падчас маёй работы ў парламенце. І хачу вас запэўніць, што на момант яго прыняцця гэта быў самы змястоўны дакумент, які здолеў замяніць сабой каля паўсотні нарматыўна-прававых актаў. Ён ахапіў абсалютна ўсе бакі адукацыйнага працэсу — ад дашкольнага выхавання да павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Але час ідзе: з моманту прыняцця Кодэкса прайшло ўжо два гады. Зразумела, што прадугледзець наперад абсалютна ўсё было немагчыма. Па-першае, сёння, ва ўмовах ЕўрАзЭс, перад сістэмамі адукацыі нашых краін адкрываюцца новыя інтэграцыйныя магчымасці, але, разам з тым, абвастраецца і канкурэнцыя. Гэтыя моманты трэба ўлічваць. Абвастрылася і дэмаграфічная сітуацыя ў нашай краіне. Сёння ў класе ў сельскай школе можа быць усяго адзін вучань, а два гады таму класаў з такой напаўняльнасцю было няшмат. І мы бачым, што выдаткі на адукацыю ў разліку на аднаго навучэнца растуць. Ёсць пытанні і з функцыянаваннем школьных факультатываў. Галоўным прызначэннем факультатываў у школах было задавальненне інтарэсаў навучэнцаў у вывучэнні асобных прадметаў на больш паглыбленым узроўні, але сёння мы маем фактычна некіруемую сістэму факультатываў. Шэраг пытанняў, якія патрабуюць унясення карэкціровак, звязаны з функцыянаваннем сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Менавіта таму мы папрасілі кіраўніка дзяржавы павялічыць працягласць маніторынгу дзеяння Кодэкса яшчэ на год. Каб па выніках не аднаго, а двух навучальных гадоў зрабіць больш грунтоўныя высновы і ўнесці свае прапановы па ўнясенні змяненняў у Кодэкс.

### Пра вучэбныя нагрузкі...

**— Шчыра кажучы, ваша заява пра тое, што школьныя заняткі могуць быць падоўжаны на месяц, прагучала напярэдадні новага навучальнага года як гром сярод яснага неба. Мяркую, што бацькі школьнікаў, хутчэй ахвяруюць суботай, чым дадуць згоду на тое, каб дзеці вучыліся ў чэрвені. Пагадзіцеся, у нас складваецца крыху дзіўная сітуацыя: бацькі скардзяцца на тое, што іх дзеці літаральна задыхаюцца ад школьных нагрузак, але пры гэтым многія спрабуюць знайсці сваім дзецям яшчэ і рэпетытара. Субота ва ўсіх — выхадны дзень. А ў чэрвені мы ўсе ўжо генетычна запраграмаваныя на школьныя канікулы... І як быць?**

— Давайце адразу расставім усе кропкі над «і». Інтарэсы Міністэрства адукацыі ні ў якім разе не могуць разыходзіцца з інтарэсамі бацькоў школьнікаў і саміх дзяцей. Колькі гадоў таму, калі прымалася рашэнне аб пераходзе школы на вучэбную пяцідзёнку, усе бацькі былі аднадушныя: суботу трэба вызваляць ад школьных заняткаў. Таму вяртацца да ўрокаў у суботу мы не плануем.

СТАР. 3

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Мар'яна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

***«Тэрміны павышэння пенсій у Беларусі выконваюцца, гэта пытанне не павінна хваляваць нашых пенсіянераў. Чарговае і апошняе ў гэтым годзе павышэнне пенсій у Беларусі будзе праводзіцца з 1 лістапада. Павышэнне пенсій наўпрост залежыць ад таго, наколькі павысіцца заработная плата ў трэцім квартале. Працэнт гэты будзе вядомы, як толькі будуць гатовыя статыстычныя даныя, пасля гэтага ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку будзе зроблены пераразлік. Усе пенсіі будуць выплачаныя своечасова ва ўстаноўленыя тэрміны».***

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 12° |
| Віцебск | + 11° |
| Гомель | + 16° |
| Гродна | + 12° |
| Магілёў | + 14° |
| Мінск | + 13° |

### Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.10.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8570,00 | ▼ |
| Еўра | 11140,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 276,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1053,15 | ▼ |

### НА ВЫХАДНЫЯ АБ'ЯЎЛЕНА ШТАРМАВОЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ

На большай частцы тэрыторыі Беларусі на выхадныя аб'яўлена штармавое папярэджанне, паведамілі БЕЛТА ў Рэспубліканскім гідраметэацэнтры. У суботу, 6 кастрычніка, на большай частцы тэрыторыі краіны, у прыватнасці ў Мінскай вобласці і Мінску, чакаецца ўзмацненне ветру з парывамі да 15-22 метраў у секунду. У паўночных раёнах парывы ветру месцамі дасягнуць 23-25 метраў у секунду.

### ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю працу **18 кастрычніка 2012 года ў 10 гадзін** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца **18 кастрычніка 2012 года з 9.00 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.


БПС-СБЕРБАНК

**В связи с изменением условий привлечения денежных средств в срочные банковские депозиты физических лиц с 08.10.2012 ОАО «БПС-Сбербанк» устанавливает следующий размер процентов:**

- по вновь привлекаемым и автоматически продлеваемым депозитам в белорусских рублях:

СР НБ РБ с 12.09.2012 – 30% годовых

| Наименование депозита/ сумма вклада | Размер процентов (годовых) по срокам привлечения | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 90-189 дней | 190-369 дней | 370-500 дней | 501-750 дней | 751-1000 дней |
| **«Сохраняй»** | | | | | |
| от 500 тыс. до 5 млн. | 24,5 (СР-5,5 п.п.) | 26,75 (СР-3,25) | 28,75 (СР-1,25 п.п.) | 30,75 (СР+0,75 п.п.) | 32,75 (СР+2,75 п.п.) |
| от 5 млн. до 25 млн. | 26(СР-4 п.п.) | 27,75 (СР-2,25 п.п.) | 30(СР) | 32 (СР+2 п.п.) | 34 (СР+4 п.п.) |
| от 25 млн. до 100 млн. | 26,75 (СР-3,25 п.п.) | 28,5 (СР-1,5 п.п.) | 30,5 (СР+0,5 п.п.) | 32,75 (СР+2,75 п.п.) | 34,75 (СР+4,75 п.п.) |
| от 100 млн. | 27(СР-3 п.п.) | 28,75 (СР-1,25 п.п.) | 31 (СР+1 п.п.) | 33 (СР+3 п.п.) | 35 (СР+5 п.п.) |
| **«Пополняй»** | | | | | |
| от 500 тыс. до 5 млн. | 24,25 (СР-5,75 п.п.) | 26,5 (СР-3,5 п.п.) | 28,5 (СР-1,5 п.п.) | 30,5 (СР+0,5 п.п.) | 32,5 (СР+2,5 п.п.) |
| от 5 млн. до 25 млн. | 25,75 (СР-4,25 п.п.) | 27,5 (СР-2,5 п.п.) | 29,75 (СР-0,25 п.п.) | 31,75 (СР+1,75 п.п.) | 33,75 (СР+3,75 п.п.) |
| от 25 млн. до 50 млн. | 26,5 (СР-3,5 п.п.) | 28,25 (СР-1,75 п.п.) | 30,25 (СР+0,25 п.п.) | 32,5 (СР+2,5 п.п.) | 34,5 (СР+4,5 п.п.) |
| от 50 млн. до 100 млн. | 26,75 (СР-3,25 п.п.) | 28,5 (СР-1,5 п.п.) | 30,5 (СР+0,5 п.п.) | 32,75 (СР+2,75 п.п.) | 34,75 (СР+4,75 п.п.) |
| от 100 млн. | 26,9 (СР-3,1 п.п.) | 28,7 (СР-1,3 п.п.) | 30,9 (СР+0,9 п.п.) | 32,9 (СР+2,9 п.п.) | 34,9 (СР+4,9 п.п.) |
| Наименование депозита / неснижаемый остаток | | | | | |
| **«Управляй»** | | | | | |
| 1,5 млн. | 19(СР-11 п.п.) | 21(СР-9 п.п.) | 23(СР-7 п.п.) | 25(СР-5 п.п.) | 27(СР-3 п.п.) |
| 5 млн. | 20(СР-10 п.п.) | 22(СР-8 п.п.) | 24(СР-6 п.п.) | 26(СР-4 п.п.) | 28(СР-2 п.п.) |
| 25 млн. | 23(СР-7 п.п.) | 26(СР-4 п.п.) | 28(СР-2 п.п.) | 30(СР) | 32(СР+2 п.п.) |
| 100 млн. | 24(СР-6 п.п.) | 27(СР-3 п.п.) | 29(СР-1 п.п.) | 31(СР+1 п.п.) | 33(СР+3 п.п.) |

- по вновь привлекаемым и автоматически продлеваемым депозитам в иностранной валюте:

| Наименование депозита/ сумма вклада | Размер процентов (годовых) по срокам привлечения | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 90-189 дней | 190-369 дней | 370-500 дней | 501-750 дней | 751-1000 дней |
| **«Сохраняй»** | | | | | |
| от 100 до 1 000 USD/EUR от 3 000 до 30 000 RUB | 4,3 | 4,9 | 5,4 | 5,8 | 6,1 |
| от 1 000 до 5 000 USD/EUR от 30 000 до 150 000 RUB | 4,5 | 5,1 | 5,6 | 6,0 | 6,3 |
| от 5 000 до 20 000 USD/EUR от 150 000 до 600 000 RUB | 4,8 | 5,4 | 5,8 | 6,3 | 6,6 |
| от 20 000 USD/EUR от 600 000 RUB | 5,2 | 5,8 | 6,3 | 6,7 | 7,0 |
| **«Пополняй»** | | | | | |
| от 100 до 1 000 USD/EUR от 3 000 до 30 000 RUB | 4,2 | 4,8 | 5,3 | 5,7 | 6,0 |
| от 1 000 до 5 000 USD/EUR от 30 000 до 150 000 RUB | 4,4 | 5,0 | 5,5 | 5,9 | 6,2 |
| от 5 000 до 10 000 USD/EUR от 150 000 до 300 000 RUB | 4,6 | 5,2 | 5,7 | 6,1 | 6,4 |
| от 10 000 до 20 000 USD/EUR от 300 000 до 600 000 RUB | 4,8 | 5,4 | 5,9 | 6,3 | 6,6 |
| от 20 000 до 50 000 USD/EUR от 600 000 до 1 500 000 RUB | 5,0 | 5,6 | 6,1 | 6,5 | 6,8 |
| от 50 000 USD/EUR от 1 500 000 RUB | 5,2 | 5,8 | 6,3 | 6,7 | 7,0 |
| Наименование депозита/ неснижаемый остаток | | | | | |
| **«Управляй»** | | | | | |
| 500 USD/EUR, 15 000 RUB | 3,6 | 4,2 | 4,7 | 5,1 | 5,4 |
| 1 000 USD/EUR, 30 000 RUB | 3,8 | 4,4 | 4,9 | 5,3 | 5,6 |
| 5 000 USD/EUR, 150 000 RUB | 4,1 | 4,7 | 5,2 | 5,6 | 5,9 |
| 20 000 USD/EUR, 600 000 RUB | 4,5 | 5,1 | 5,6 | 6,0 | 6,3 |

По депозитам «Сохраняй», «Пополняй», «Управляй» в иностранной валюте, привлеченным до 08.10.2012, установленный размер процентов будет применен с 08.11.2012.

С 08.10.2012 ОАО «БПС-Сбербанк» начинает привлечение средств физических лиц в новый срочный банковский депозит в белорусских рублях «Приумножай» на следующих условиях:

| Валюта депозита | Белорусские рубли |
|---|---|
| **Срок привлечения депозита** | 33 дня |
| **Минимальная сумма первоначального взноса** | 5 000 000 рублей |
| **Размер процентов, выплачиваемых по депозиту** | 32% годовых (фиксированный) |
| **Дополнительные взносы** | В течение установленного по депозиту срока привлечения Вкладчик вправе пополнять его дополнительными взносами на любую сумму. |
| **Условия досрочного востребования депозита** | При досрочном востребовании депозита проценты по депозиту пересчитываются, исходя из фактического срока хранения депозита, по ставке, установленной по текущим счетам физических лиц (с учетом изменения ее размера в период размещения депозита). |
| **Порядок возврата (переоформления) депозита** | Невостребованные Вкладчиком депозит и причисленные проценты по окончании срока переоформляются и хранятся на Условиях срочного банковского депозита «Сохраняй». |

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка **www.bps-sberbank.by** или по номеру **148** в стационарной и мобильных сетях.

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2011 г. (млрд. руб.): январь – 6,1; февраль – 6,0; март – 6,6; апрель – 6,2; май – 7,2; июнь – 7,5; июль – 8,7; август – 10,9; сентябрь – 13,1; октябрь – 16,7; ноябрь – 19,5; декабрь – 24,1.

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 10.10.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»*

# БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯДОЎНА ПРЫТРЫМЛІВАЕЦЦА ЗБАЛАНСАВАНАГА І МІРАЛЮБІВАГА КУРСУ Ў ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прымаючы даверчыя граматы пасла Казахстана ў Беларусі Ергалі Булегенава, Прэзідэнт адзначыў, што Казахстан з'яўляецца даўнім сябрам і важнейшым стратэгічным партнёрам Беларусі ў Цэнтральнай Азіі. Ён звярнуў увагу на тое, што за апошні час удалося надаць якасна новую дынаміку двухбаковаму гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву.

«Мы зацікаўлены ў максімальным выкарыстанні пераваг еўразійскай інтэграцыі і ў бліжэйшы час разлічваем выйсці на сумесныя праекты не толькі прамысловай кааперацыі, але і ў энергетычнай сферы, у галіне новых тэхналогій і тэлекамунікацый, транспарту і лагістыкі, сельскай гаспадарцы.

«Нашы еўрапейская і еўразійская інтэграцыі павінны быць адзінымі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт выказаў надзею, што ва ўмовах Адзінай эканамічнай прасторы значна актывізуецца інвестыцыйнае супрацоўніцтва.

Звяртаючыся да пасла Грузіі ў Беларусі Давіда Катарыя, Аляксандр Лукашэнка выказаў вялікую зацікаўленасць у далейшым развіцці ўзаемавыгаднага дыялогу па самым шырокім спектры пытанняў. Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што трывалым фундаментам для гэтага з'яўляюцца дружалюбныя адносіны паміж народамі дзвюх краін. Ён таксама выказаў удзячнасць за тую каласальную падтрымку, якую Грузія аказвае Беларусі на міжнароднай арэне.

«Лічу, што сёння неабходна актывізаваць двухбаковыя кантакты па ўсіх напрамках. І, у першую чаргу, лакаматывам гэтаму павінна паслужыць эканоміка», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. Прэзідэнт падкрэсліў, што разлічвае на больш цесныя кантакты з грузінскім бокам.

Аляксандр Лукашэнка таксама пацвердзіў, што будзе ўсяляк старацца, каб Грузія вярнулася ў СНД. «Нехта там сказаў, што ў Грузіі ў парадку дня не стаіць пытанне па СНД. Я думаю, што калі сёння не стаіць, то заўтра можа з'явіцца», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Тым больш, што СНД — гэта сёння арганізацыя без якіх-небудзь вялікіх канкрэтных абавязацельстваў. Тут можна весці дыскусіі па пытаннях, што датычацца ўсёй постсавецкай прасторы. А Грузію і я, і беларускі народ ніколі не адрывалі ад нашага мінулага, ад таго, што мы былі ў адной краіне. Думаю, гэта будзе нядрэнна, калі ваш прадстаўнік будзе працаваць у СНД», — сказаў Прэзідэнт.

«Я яшчэ раз пацвярджаю, што буду ўсяляк старацца, калі Беларусь, як гэта плануецца, будзе працаваць на чале СНД у будучым годзе, каб Грузія выкарыстала і гэты шлях нармалізацыі адносін не толькі з Расіяй, але і з усімі постсавецкімі дзяржавамі, з якімі ёй трэба нармалізаваць адносіны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, сапраўды даверныя канструктыўныя адносіны звязваюць Беларусь і Туркменістан.

Сустрэчы на вышэйшым узроўні, якія сталі за апошнія гады рэгулярнымі, пацвярджаюць высокую ступень ўзаемаразумення і дружалюбны характар сувязяў паміж двума народамі. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на той факт, што рэалізацыя дасягнутых прэзідэнтамі дзвюх краін дамоўленасцяў надала беларуска-туркменскім адносінам стратэгічны характар.

Звяртаючыся да ўсіх дыпламатаў, Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што сумленная і адкрытая пазіцыя дасць магчымасць ім камфортна жыць і паспяхова працаваць на беларускай зямлі і адкрые перад імі ўсе дзверы. «Прынамсі, я буду гэтаму ўсяляк садзейнічаць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Ваша эфектыўная штодзённая работа стане залогам канкрэтных вынікаў і дамоўленасцяў, якія адлюстроўваюць сапраўдную зацікаўленасць нашых народаў у развіцці ўзаемавыгадных адносін». Аляксандр Лукашэнка пажадаў дыпламатам поспехаў і падкрэсліў, што разлічвае на іх аб'ектыўнае і паважлівае стаўленне да Беларусі і перш за ўсё яе народа.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

# ДВА ПЫТАННІ НАМЕСНІКУ МІНІСТРА ЖКГ

**У мінулым нумары мы апублікавалі матэрыялы анлайн-канферэнцыі, якая прайшла з удзелам намесніка міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Анатоля ШАГУНА на сайце БЕЛТА. Сёння — працяг тэмы.**

***Ці можна абсталяваць кватэры індывідуальнымі прыборамі ўліку цяпла на такім жа прынцыпе, як калісьці зрабілі з прыборамі ўліку вады?***

Новае жыллё сёння, як правіла, усё будуецца з рэгулятарамі на сістэмах ацяплення, якія стаяць на кожнай батарэі. Яны дазваляюць усталяваць большую або меншую тэмпературу. Гэта магчыма зрабіць, калі на кожную кватэру стаіць гарызантальная разводка — гэта значыць, цепланосьбіт заводзіцца ў кожную кватэру, выводзіцца з кожнай кватэры асобна. Тады можна паставіць лічыльнік, а ў чалавека будзе стымул эканоміць, паколькі ён бачыць канкрэтна сваё спажыванне. Што тычыцца жылля, якое было пабудавана ў 1960—1980-я гады, тут мы маем вертыкальную разводку — гэта значыць, стаякі праходзяць скразныя з першага на апошні паверх, і індывідуальны ўлік рабіць нявыгадна. Можна, але гэта вельмі дорага. Прыборы рэгулявання ў старых дамах, у якіх праводзіцца капітальны рамонт, ставяцца на батарэі. Але асобнаму чалавеку гэта зрабіць цяжка.

Калі ж у дамах разводка гарызантальная, але па нейкіх прычынах прыборы ўліку цяпла і рэгулятары не стаяць, то ўсё гэта можна зрабіць. У новых дамах створаны таварыствы ўласнікаў, там прымаюцца рашэнні, ці будуць члены таварыства разлічвацца па прыборах, ці не будуць.

Тэхнічна перавод з вертыкальнай на гарызантальную разводку вельмі складаны. І нават пры правядзенні капітальнага рамонту мы гэтага не робім, таму што гэта пералік і перاробка ўсёй сістэмы ацяплення жылога дома.

Вядома, асабістая зацікаўленасць грамадзян — гэта вялікая справа, але тэхнічныя праблемы рэалізацыі вырашыць немагчыма. Гэтае пытанне разглядалася, але не было прызнана мэтазгодным.

***Ці будуць больш актыўна прыцягвацца прыватныя кампаніі ў жыллёва-камунальную сферу краіны?***

Цяпер у абслугоўванні жыллёвага фонду працуе каля 20 прыватных кампаній. Вядома, гэта мала, але за апошні час іх колькасць і аб'ёмы аказання імі паслуг павялічыліся. Большасць прыватных кампаній абслугоўвае таварыствы ўласнікаў дамоў-новабудоўляў, але ёсць зрухі і ў старым жыллёвым фондзе. Так, у Барысаве прадпрыемства «Чысты свет» з замежным капіталам узяло на тэхнічнае абслугоўванне 12 жылых дамоў і абмяркоўвае магчымасць пашырэння, працы не толькі ў Барысаве, але і ў іншых населеных пунктах. Па іншых кірунках дзейнасці ЖКГ можна ў якасці прыкладу назваць вядомую для мінчан фірму па зборы і вывазе бытавых адходаў «Рэмонтис» з удзелам нямецкага капіталу.

Для нас у першую чаргу цікава прыцягненне прыватнага бізнэсу ў эксплуатацыю жыллёвага фонду. Стварэнне канкурэнцыі прывядзе да павышэння якасці паслуг. Якія тут праблемы? Для інвестара патрэбны простыя і зразумелыя, празрыстыя правілы гульні, работы на рынку. Замежныя кампаніі прывыклі, што 100% паслуг аплачвае спажывец, і яны маюць адносіны толькі з ім. А ў Беларусі ёсць яшчэ бюджэтнае субсідзіраванне паслуг. Пэўныя нормы, нарматывы, уліковая палітыка, узаемадзеянне з бюджэтам — напэўна, гэта палохае кампаніі. Яны ў сябе так не працуюць, не ведаюць, як гэта выглядае, якія гарантыі. Можа, лічаць некалькі павялічанымі рызыкі, раз выдаткі пакрывае не пэўны спажывец, з якім ёсць дамова, а бюджэт. Выхад на 100% аплаты тэхабслугоўвання будзе спрыяць канкурэнцыі ў сферы абслугоўвання жыллёвага фонду. Заканадаўчыя крокі ў гэтым кірунку зроблены.

У новым Жыллёвым кодэксе закладзены падыход, што тэхабслугоўванне — адна паслуга, бягучы рамонт — іншая. Бягучы рамонт будзе аплачвацца па факце яго выканання. Перайшоўшы да ўліку выдаткаў па кожным доме, мы зможам тэхнічнае абслугоўванне зраўнаваць, людзі змогуць убачыць у жыроўцы, якія паслугі ім аказаны. У суме з тарыфнай палітыкай мы спадзяёмся ў бліжэйшы час (гэта досыць блізкая перспектыва) выйсці на 100%-нае пакрыццё выдаткаў і такім чынам зацікавіць прыватныя кампаніі браць жылфонд на тэхабслугоўванне на больш простых умовах. Казаць пра тое, што гэты бізнэс стане больш выгадным, не даводзіцца, але ён стане прасцей.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

**«Прамая лінія»**

ВЫДЗЯЛЕННЕ ЗЯМЕЛЬНЫХ УЧАСТКАЎ ПАД ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА, ПЫТАННІ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ І РЭГІСТРАЦЫІ МАЁМАСЦІ

12 кастрычніка, у пятніцу, з 12.00 да 13.00 у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Георгія Іванавіча КУЗНЯЦОВА.** Кіраўнік камітэта адкажа на актуальныя пытанні зямельных адносін, аховы і выкарыстання зямельных рэсурсаў.

**Нумары «прамой лініі»: 8 (017) 292 38 92; 8 (017) 292 38 21. Папярэднія пытанні можна дасылаць на электронны адрас: infp@zvyazda.minsk.by.**

# З МІНСКА Ў ВІЛЬНЮС МОЖНА БУДЗЕ ПАТРАПІЦЬ ХУТЧЭЙ

**Даехаць на цягніку з беларускай сталіцы ў літоўскую і вярнуцца назад можна будзе хутчэй, чым зараз — у 2013 годзе запланавана скарачэнне часу руху цягніка паміж Мінскам і Вільнюсам на 30 хвілін. Гэтае пытанне абмеркавалі начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір МАРОЗАЎ і генеральны дырэктар АТ «Літоўская чыгунка» Стасіс ДАЙЛІДКА падчас сустрэчы, якая прайшла ў рамках правядзення VI Беларускага транспартна-лагістычнага форуму.**

Нагадаем, што Беларуская чыгунка сумесна з літоўскімі калегамі ажыццяўляе рэалізацыю праекта па павышэнні хуткасцяў у пасажырскіх чыгуначных зносінах паміж Мінскам і Вільнюсам. Падчас першага этапу летась час руху пасажырскіх цягнікоў паміж імі быў скарочаны з 4 да 3 гадзін. А ў ходзе рэалізацыі другога этапу праекта плануецца з 1 чэрвеня 2013 года скараціць час яшчэ на 30 хвілін — да 2,5 гадзіны. Прычым Беларуская чыгунка скароціць час на 23 хвіліны, а літоўская — на 7. Гэта стане магчымым за кошт уводу ў эксплуатацыю сучасных дызель-цягнікоў на парытэтных умовах, мадэрнізацыі чыгуначнай інфраструктуры, скарачэння часу на правядзенне памежнага і мытнага кантролю і змянення тэхналогіі іх правядзення. Падрабязнасці расказаў «Звяздзе» Валерый СТРАМУК, намеснік начальніка Беларускай чыгункі:

— Папярэдне прагладаецца такі варыянт: літоўскі бок у Вільнюсе арганізуе памежны і мытны агляд, які будзе па варыянце самалётнага. А мы прапрацоўваем з нашымі органамі агляд на ўчастку Гудагай-Маладзечна падчас руху цягніка. А ў далейшым Беларуская чыгунка разглядае і варыянт накшталт літоўскага — каб агляд праводзіць на станцыі Мінск-Пасажырскі.

Што тычыцца закупкі новага рухомага саставу, то зараз Беларуская чыгунка разглядае магчымасць выкарыстання дызель-цягнікоў вытворчасці ААТ «Белкамунмаш» сумесна з польскай кампаніяй АТ «PESA Bydgoszcz SA» у трохсекцыйным выкананні. У перспектыве плануецца зрабіць і электрыфікацыю чыгункі на ўчастках Маладзечна — Гудагай — дзяржаўная мяжа — Кяна — Новая Вільня. Як адзначылі ў Беларускай чыгунцы, на сёння праект «Электрыфікацыя ўчастка Маладзечна — Гудагай — дзяржмяжа» падрыхтаваны і зараз праводзіцца яго дзяржаўная экспертыза.

— Калі будзе поўнасцю праведзена электрыфікацыя і зроблена інфраструктура, то час руху цягніка можам скараціць і да дзвюх гадзін, — перакананы Стасіс Дайлідка.

Па яго ацэнках, літоўскаму боку электрыфікацыя будзе каштаваць каля 20 млн еўра, а новыя цягнікі — яшчэ 30-40 млн еўра. Таксама, па яго словах, плануецца павялічыць і колькасць рэйсаў паміж Мінскам і Вільнюсам: калі сёння цягнік ідзе раніцай, а вяртаецца вечарам, то ў хуткім часе ён будзе ісці туды і адразу ж вяртацца назад. Генеральны дырэктар АТ «Літоўская чыгунка» адзначыў, што бачыць вялікі патэнцыял у далейшым развіцці і ўдасканаленні пасажырскага чыгуначнага руху паміж сталіцамі дзвюх дзяржаў:

— Аўтамабільным транспартам ехаць у гэтым кірунку больш складана: на мяжы ў пунктах пропуску чэргі, а калі пачне дзейнічаць бязвізавы рэжым на 50 км, то яны і яшчэ павялічацца. Таму чыгункай ехаць прасцей, у тым ліку і па мытных працэдурах: хутчэй і больш бяспечна.

Па інфармацыі Беларускай чыгункі, сёлета за 8 месяцаў паміж Вільнюсам і Мінскам было перавезена 180 тысяч пасажыраў, што на 52,2% больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Прычым цягнікамі №15/16 і № 37/38 перавезена 164,4 тысячы пасажыраў, з якіх 119,4 тысячы прыпадае на цягніковую пару №15/16 Мінск — Вільнюс, што сведчыць пра дамінаванне прамога беларускага пасажырапатоку.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# АКЦЭНТЫ ТЫДНЯ
## з Вадзімам Гігіным



**У нас.** Напярэдадні, ды яшчэ ў сам дзень 2 кастрычніка, многія прадказвалі такі лік: 1:3. Праўда, на карысць зусім іншай каманды. У выніку на полі мінскага стадыёна «Дынама» сапраўды было забіта чатыры мячы, аднак тры з іх трапілі ў вароты «Баварыі», што маглі прадбачыць адзінкі найбольш упартых і адданых заўзятараў БАТЭ.

Зразумела, мы не будзем зараз займацца прафесійным разборам матча, які ўжо стаў легендарным (і тут няма залішняга пафасу). Хай гэта робяць спецыялісты. І ўсё ж было б легкадумна сцвярджаць, што дзве запар перамогі, атрыманыя барысаўскім клубам над грандамі еўрапейскага футбола («Лілем» і «Баварыяй») маюць толькі спартыўнае значэнне.

Я не люблю замежнае слова «брэнд», хоць часта яго цяжка замяніць якімсьці іншым. БАТЭ паступова становіцца адным з галоўных брэндаў сучаснай Беларусі. На Захадзе мала ведаюць пра нашу краіну. А калі нешта і чулі, то, хутчэй за ўсё, пэўныя прапагандысцкія стэрэатыпы. Так выпадае, што ў хуткім часе які-небудзь немец ці француз, пачуўшы назву «Беларусь», імгненна выдасць: «А, гэта там, адкуль БАТЭ». І ўжо зусім, відаць, не разлічваў на буйную еўрапейскую славу невялікі па памерах Барысаў.

Тое, што ў нацыянальныя брэнды, пазнавальныя ва ўсім свеце, прабілася менавіта футбольная каманда, невыпадкова. Гэта заканамерны вынік той палітыкі, якая праводзіцца ў нашай дзяржаве. Яна ў пэўным сэнсе гэтага слова спартацэнтрычная. Дарэчы, вялікае захапленне кіраўніцтва краіны спортам, бывае, выклікае крытыку з боку апазіцыі. Але такая палітыка дае плён. Не магло б атрымацца такой з'явы, як БАТЭ, без тых новых спарткомплексаў, што пабудаваны апошнім часам, без тых вялікіх фінансавых укладанняў, якія зроблены ў гэтую галіну. Іншая справа, што часам самі спартыўныя функцыянеры не могуць эфектыўна скарыстацца гэтай падтрымкай. Але толькі не БАТЭ. Тут атрымалася вельмі добрае спалучэнне адразу некалькіх фактараў: добрая эканамічная база ў выглядзе самога завода БАТЭ, якасны менеджмент, прадстаўлены Анатолем Капскім, таленавіты трэнер Віктар Ганчарэнка і ўпэўненая ў сваіх сілах зладжаная каманда.

Часта можна пачуць, што нам не хапае ідэалагічных слоганаў, якія аб'ядноўвалі б краіну. Хто ведае, можа, зараз нараджаецца адзін з такіх слоганаў: «Працуйце так, як гуляе БАТЭ. І будзе вам поспех!»

**Вакол нас.** Першая навіна не толькі на постсавецкай прасторы — вынікі выбараў у Грузіі. Апазіцыйны рух «Грузінская мара» перамог праўладны «Адзіны нацыянальны рух».

Зразумела, чаму парламенцкія выбары ў параўнальна невялікай краіне выклікалі такую хвалю каментароў і вялікую зацікаўленасць у многіх сталіцах. Грузінскі прэзідэнт Міхаіл Саакашвілі — стапрацэнтна празаходні палітык, абсалютна непрымальны для Масквы. Пасля вайны 2008 года Расія прыклала вялікія намаганні, каб усталяваць добрыя і трывалыя стасункі з лідарамі апазіцыі ў Грузіі. Ніно Бурджанадзэ і Георгій Хаіндрава, былыя высокапастаўленыя члены каманды Саакашвілі, былі набліжаны Крамлём. І тут раптоўна ўсплыла фігура ўплывовага бізнэсмена Біндзіны Іванішвілі, які наблытаў шмат чаго ў картах вялікай палітычнай гульні, што вядзецца вакол Грузіі. Чаго ад яго чакаць? Куды ён павядзе краіну? На якія знешнепалітычныя сілы зробіць стаўку?

Пакуль адназначна можна прадказаць толькі наступнае. Іванішвілі, хутчэй за ўсё, стане прэм'ер-міністрам Грузіі. Усё астатняе не зусім зразумела. З аднаго боку, ён робіць заявы пра неадменнасць еўраатлантычнай інтэграцыі, з другога — абяцае нармалізаваць адносіны з Расіяй. Аднак гэтыя мэты амаль несумяшчальныя.

А што ж Беларусь? Чаго нам чакаць ад выніку тых выбараў? І вось тут грузінскі прыклад вельмі паказальны. Курс нашай краіны на постсавецкай прасторы пракладзены так, што хто б ні перамог на выбарах, нам забяспечаны добрыя двухбаковыя адносіны. Застаючыся верным саюзнікам Расіі, Беларусь захоўвала добрыя адносіны з афіцыйным Тбілісі, нават атрымлівала ад яго палітычную падтрымку ў сваіх спрэчках з Еўрасаюзам. Падчас адносна нядаўніх прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне Мінск задаволіла б перамога любога з кандыдатаў: Януковіча, Юшчанкі альбо Цімашэнкі. І гэтыя прыклады можна працягваць. Ва ўсялякім разе, для Беларусі Грузія застаецца важным партнёрам у рэгіёне. Нельга адмаўляць і таго, што нашай краіне прыйдзецца адыграць сваю ролю ў аднаўленні адносін Масквы і Тбілісі.

**З гісторыі.** 4 кастрычніка 1980 года — дзень, які добра памятаюць у Беларусі. Тады, 32 гады таму, у аўтакатастрофе загінуў першы сакратар ЦК Кампартыі рэспублікі Пётр Міронавіч Машэраў.

Вакол гэтай смерці ходзіць шмат чутак. Маўляў, хацелі прызначыць Машэрава прэм'ерам саюзнага ўрада замест хворага Касыгіна, але не ўсім у Крамлі (ці то на Лубянцы) гэта было даспадобы. Што тут сказаць? Асабіста я не прыхільнік канспіралагічных тэорый. Ды і ўсе факты сведчаць, што ў той кастрычніцкі дзень адбыўся незвычайны, але трагічны выпадак, збег акалічнасцяў. Нарэшце, не ў норавах брэжнеўска-андропаўскага кіраўніцтва было забіваць сваіх калег па партыйнай вярхушцы.

Але гаворка зараз не пра гэта. Машэраў быў сапраўдным феноменам у нашай гісторыі. Так, ён быў партыйным функцыянерам. І ўсё ж карыстаўся вялікай усенароднай павагай. Дарэчы, як да яго і Кірыл Мазураў. Гэта была плеяда выдатнага т.зв. «партызанскага прызыву» ў беларускай уладзе. Казлоў, Прытыцкі, Сурганаў — усе яны (і многія іншыя) таго мазураўска-машэраўскага гатунку. У БССР той парой амаль не было дысідэнтаў — толькі невялічкія групкі інтэлігентаў-нонканфармістаў. Чаму? Улада была надзвычай набліжана да народа, у адрозненне ад сітуацыі ў Маскве ці Ленінградзе. Партызанскі рух у гады Вялікай Айчыннай у Беларусі быў сапраўды ўсенародны, і калі вышэйшыя пасады сталі займаць выхадцы з партызанскіх атрадаў і падпольных груп, якіх многія памяталі па сумесных баях, то людзі адчулі давер, успрынялі гэта як гістарычную справядлівасць.

Безумоўна, Машэраў быў сынам свайго часу. Але ён валодаў неардынарным палітычным талентам. Шмат з таго, што зараз спецыяльна падрыхтаваныя тэхнолагі раяць сваім «падапечным» у адносінах з публікай, у Машэрава ішло само сабой, з вопыту, ад душы. Проста кажучы, ён адчуваў людзей, і людзі давяралі яму.

Пра гэтага чалавека можна пісаць і пісаць... Лепш за ўсё — проста падзякаваць і ўшанаваць памяць таго, хто аддаў усе свае сілы, каб Беларусь стала годнай краінай, і людзі ў ёй жылі не горш за астатніх.

Каментарыі дасылайце на адрасы:
gigin@belta.by
і info@zvyazda.minsk.by


**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков сроком на 25 лет в г. Кировске**

**Организатор проведения аукциона – Кировский районный исполнительный комитет Могилевской области**

| Адрес и площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы, связанные с формированием и регистрацией земельных участков (руб.) | Характеристика земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|
| г. Кировск, ул. Кирова, центральный рынок – 0,0031, торговый павильон № 1 (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | 722550100001002864 | 658 190 | 131 638 | 4 222 214 | Для всех участков – рядом электричество, централизованные водоснабжение, водоотведение, асфальтовое покрытие. |
| г. Кировск, ул. Кирова, центральный рынок – 0,0030, торговый павильон № 2 (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | 722550100001002865 | 636 958 | 127 392 | 4 222 214 | |
| г. Кировск, ул. Кирова, центральный рынок – 0,0052, торговый павильон № 3 (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | 722550100001002866 | 1 104 061 | 220 812 | 4 464 662 | |
| г. Кировск, ул. Кирова, центральный рынок – 0,0030, торговый павильон № 4 (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | 722550100001002868 | 636 958 | 127 392 | 4 222 214 | |
| г. Кировск, ул. Кирова, центральный рынок, торговый павильон – 0,0080 (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | 722550100001002869 | 1 698 555 | 339 711 | 4 963 234 | |
| г. Кировск, ул. Орловского, район автостанции, торговый объект по продаже сельскохозяйственной продукции (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) – 0,0150 га | 722550100001002875 | 3 436 872 | 687 374 | 5 173 234 | |
| г. Кировск, ул. Орловского, напротив ф-ла РУП «Могилевоблгаз», платная автомобильная стоянка (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей) – 1,00 га | 722550100001002878 | 173 690 496 | 34 738 099 | 3 362 730 | |

**Аукцион состоится 26 ноября 2012 г. в 16.15 по адресу: г. Кировск, ул. Кирова, 80, 1 этаж, зал заседаний. Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (землеустроительная служба Кировского райисполкома) по адресу: г. Кировск, ул. Пушкинская, 21а, каб. 8 в рабочие дни с даты опубликования извещения до 17.00 20 ноября 2012 г. Заключительная регистрация участников аукциона – 26 ноября 2012 г. с 15.00 до 15.30. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. Кировске: (802237) 25 4 96 и по адресу: ул. Пушкинская, 21а, каб. 8.**

Для участия в аукционе на право заключения договора аренды земельного участка приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Участнику необходимо в срок, указанный в извещении, подать заявление и представить в уполномоченную организацию заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Кировского райфо 3602717000012 в ЦБУ № 709 г. Кировска филиал № 703 АСБ «Беларусбанк» г. Бобруйска код 760, код платежа 04002; кроме того, в комиссию представляется гражданином копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Аукцион проводится при наличии двух и более участников. Не допускается начало торгов по начальной цене. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Участник аукциона, ставший победителем, либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты по оформлению материалов отвода и государственной регистрации создания земельного участка и расходы по публикации извещения в средствах массовой информации.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с земельными участками.


# Місія МАГАТЭ станоўча ацаніла ядзерна-энергетычную інфраструктуру Беларусі

**Намеснік генеральнага дырэктара Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі Аляксандр Бычкоў прыехаў у Беларусь, каб абмеркаваць вынікі місіі МАГАТЭ па комплекснай ацэнцы ядзерна-энергетычнай інфраструктуры нашай краіны. Місія працавала з 16 па 30 чэрвеня 2012 года і правяла аналіз 19 напрамкаў дзейнасці, важных для паспяховай рэалізацыі праекта будаўніцтва атамнай электрастанцыі. Агульная ацэнка — добрая. Але ёсць шэраг рэкамендацый.**

## Беларусь выканае ўсе рэкамендацыі МАГАТЭ

«МАГАТЭ як арганізацыя, якая акумулюе веды ў галіне атамнай энергетыкі, сёння мае некалькі адпаведных механізмаў па падтрымцы новых і існуючых праграм, — распавядае Аляксандр Бычкоў. — Краіна, якая ўпершыню будуе атамную станцыю, павінна прайсці тры этапы: падрыхтоўчы (уся інфраструктура павінна развівацца ў адпаведным кірунку), гатоўнасць інфраструктуры да пуску, само будаўніцтва. Гэта праца нашай арганізацыі з краінамі-пачаткоўцамі. Я хачу падкрэсліць, што Беларусь — гэта адна з перадавых краін у гэтым кірунку, бо яна выкарыстоўвае ўсе механізмы, якія мы прапануваем». Місія правяла аналіз па 19 базавых параметрах, сярод якіх заканадаўства, падрыхтоўка кадраў, ядзерная бяспека, аварыйная гатоўнасць і іншае. «У выніку мы вылучылі шэраг момантаў, дзе рэкамендуем павялічыць і палепшыць тую практыку, якая ёсць у Беларусі. Мы ва ўсім свеце імкнёмся знайсці найлепшыя практыкі. У Беларусі яны таксама ёсць. Мы адзначаем стварэнне міжведамаснай камісіі, якая дазваляе аператыўна вырашаць усе пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай да будаўніцтва. Акрамя таго, Беларусь мае вельмі добры досвед у галіне радыяцыйнай абароны, тут укаранёны новыя міжнародныя стандарты. Адзначаем мы таксама добры план развіцця кадравых рэсурсаў. Важна, што была створана дзяржаўная стратэгія па выкарыстанні радыеактыўных адходаў, — пералічыў прадстаўнік МАГАТЭ і дадаў: — Дапрацоўкі неабходны ў заканадаўстве, паколькі мы лічым, што яго можна палепшыць. Гэта тычыцца сістэмы адказнасці за радыяцыйную бяспеку». Аляксандр Бычкоў сказаў, што тое, як працуюць яго калегі з Беларусі, дае поўную ўпэўненасць у тым, што рэкамендацыі будуць выкананы і што будаўніцтва станцыі будзе ісці па графіку. Тое самае паўтарыў і Дон Кавачыч, адказны кіраўнік па праекце тэхнічнага супрацоўніцтва МАГАТЭ і Рэспублікі Беларусь: «Трэба адзначыць, што Беларусь прытрымліваецца этапнага падыходу, і мы ўпэўнены, што ўрад краіны ў сваю дзейнасць уключыць выкананне нашых рэкамендацый». Пасля ён падкрэсліў, што галоўнае — гэта моцны орган рэгулявання. У нашай краіне — гэта Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. «Мы цалкам будзем выконваць і выконваем сёння ўсе рэкамендацыі. Бо гэта бяспека. Мы з вамі перажылі Чарнобыль і ведаем, што гэта такое. Па выніках місіі мы падрыхтуем разам з Нацыянальнай акадэміяй навук, органамі дзяржаўнага кіравання Нацыянальны план дзеянняў. Усе рэкамендацыі будуць улічаны», — запэўніў замежных калег намеснік міністра энергетыкі Беларусі Міхаіл Міхадзюк.

## Тэмпы выкарыстання атамнай энергіі не зніжаюцца?

МАГАТЭ пастаянна праводзіць даследаванні па ацэнцы далейшага развіцця атамнай энергетыкі. «Аварыя на Фукусіме паўплывала на гэтыя даследаванні. Зараз можна казаць аб тым, што павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці энергіі на атамных станцыях, уключаючы будаўніцтва, да 2030 года адбудзецца мінімум на 25%. Ацэнкі, якія даваліся перад аварыяй на Фукусіме, адрозніваюцца ад гэтых на 12-15%. Насамрэч тэндэнцыя да зніжэння чаканага павелічэння атамнай энергетыкі з'явілася, але аварыя не павярнула свет ад атамнай энергетыкі, — заявіў Аляксандр Бычкоў. — Так, Германія і Італія прынялі рашэнне аб тым, што яны будуць выводзіць атамную энергетыку з эксплуатацыі. Але трэба ўлічваць, што гэта вельмі доўгатэрміновы працэс. Тая ж Японія фактычна пачне выводзіць з эксплуатацыі свае атамныя станцыі толькі ў канцы 2020-х гадоў. Гэта гаворыць пра тое, што атамная энергетыка будзе яшчэ актыўна выкарыстоўвацца. Акрамя таго, ёсць краіны, дзе без атамнай энергетыкі развіццё будзе немагчыма. Гэта такія буйныя краіны, як Індыя, Кітай. Па нашых ацэнках, ёсць тры рэгіёны, дзе развіццё атамнай энергетыкі будзе працягвацца. Гэта Кітай і Усходняя Азія, уключаючы Карэю; Паўднёвая Азія, Блізкі Усход і Усходняя Еўропа (Беларусь, Украіна, Расія, Чэхія, Славакія, Румынія, Балгарыя і Польшча). У ЗША, хутчэй, будзе толькі захаванне».

## Неабходны кадры

Нягледзячы на добра прапрацаваную праграму развіцця кадраў, па пэўных момантах МАГАТЭ выказваецца за яе паляпшэнне. Кадры для атамнай энергетыкі — гэта сусветная праблема. «У Беларусі ёсць патэнцыял для падрыхтоўкі добрых кадраў. Гэта і свая адукацыйная база, і добрая сувязь з Расіяй, дзе студэнты і спецыялісты могуць навучацца і стажыравацца, і ўзважаная асабістая праграма», — лічыць намеснік гендырэктара МАГАТЭ.

## Ці трэба сумнявацца ў бяспецы?

Гэта, напэўна, самае надзённае пытанне для беларусаў, якія неабыякава ставяцца да будучыні сваёй краіны. Яны маюць на тое права і выказваюць сваю занепакоенасць бяспекай атамнай электрастанцыі. Наша грамадства зараз падзялілася на тых, хто «за» і хто «супраць». А ці можа ў гэтых пытаннях чымсьці дапамагчы МАГАТЭ? «Мы працуем толькі з дзяржаўнымі органамі. Мы не ўмешваемся ва ўнутраныя стасункі паміж прыхільнікамі атамнай станцыі і яе праціўнікамі. Але мы працуем з краінамі-ўдзельніцамі ў галіне рэкамендацый аб тым, як можна даступна і безканфліктна растлумачваць насельніцтву перавагі атамнай энергетыкі. Аднак непасрэдна ў задачы нашай місіі гэта не ўваходзіць. Так званыя «псіхалагічныя моманты» мы не разглядаем, — патлумачыў Аляксандр Бычкоў. — А калі ўвесь час думаць, што можа быць забруджванне, то пры такім разглядзе нам з вамі трэба жыць зусім па-іншаму. Мы павінны будзем спыніць выкарыстанне вугалю, транспарту і іншых выгод сучаснага жыцця. Калі вы паглядзіце статыстыку стацыянарнай працы сучасных станцый, то па радыяцыйным уздзеянні на навакольнае асяроддзе, як правіла, яны больш бясшкодныя за вугальныя станцыі».

Прагучала таксама пытанне аб тым, наколькі бяспечныя і надзейныя расійскія тэхналогіі, па якіх мы будзем будаваць і сваю станцыю. Намеснік міністра энергетыкі заявіў: «Расійская Федэрацыя зараз вельмі актыўна працуе на знешніх рынках. Яе тэхналогіі запатрабаваны ў Індыі, Кітаі, Турцыі».

Дарэчы, Міністэрства энергетыкі Беларусі павінна будзе апублікаваць справаздачу місіі МАГАТЭ з усімі заўвагамі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Фінансавы тыдзень

# БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ ІЗНОЎ «АДСТУПАЕ»

Замежныя валюты не перастаюць здзіўляць. Абнаўляюць рэкорды ў дачыненні да нацыянальнай валюты, нягледзячы на тое, што нашы золатавалютныя рэзервы застаюцца на ранейшым узроўні і на 1 кастрычніка складаюць 8,126 млрд долараў у вызначэнні Спецыяльнага стандарту распаўсюджвання звестак МВФ (у нацыянальным вызначэнні — 8,829 млрд).

За тыдзень долар падаражэў на 70 рублёў (плюс 0,8%) да 8570. Еўра дадаў яшчэ 150 рублёў (плюс 1,4%) і цяпер каштуе 11140. Расійскі рубель падняўся да 276,5 на 1,5 рубля (плюс 0,5%).

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**


*Уважаемые акционеры ОАО «Світанак» г. Жодино*

**Наблюдательный совет сообщает, что 08 ноября 2012 года СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «Світанак»,**

**расположенного по адресу: г. Жодино, ул. 8-е Марта, д. 1.**

**Собрание пройдет в актовом зале административно-бытового корпуса предприятия (на четвертом этаже).**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Избрание членов наблюдательного совета.

УНП 600038919

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в библиотеке профкома предприятия с 22 октября по 08 ноября 2012 года (время работы с 8.00 до 17.00).

Регистрация участников собрания будет производиться с 15.00 до 15.50 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 08 ноября 2012 г. в 16.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 01 марта 2012 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность!**

# «НАСТАЎНІК — ПРАФЕСІЯ АД БОГА»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Але праблема перагрузак і сапраўды існуе — толькі ў рэдкім выпадку пры сустрэчах з бацькамі не даводзіцца чуць ад іх пра гэтую праблему. Аднак вы правільна заўважылі: пры быццам бы вялікай загружанасці дзяцей у школе бацькі лічаць амаль сваім абавязкам наняць дзіцяці яшчэ і рэпетытара, прычым не толькі ў старшай школе. Таму мы вырашылі разам з Міністэрствам аховы здароўя правесці маніторынг, каб вызначыць, з чым менавіта звязаны нагрузкі на дзяцей. Што за гэтым стаіць: колькасць урокаў штодня, састаўленне раскладу ўрокаў без уліку складанасці тых ці іншых вучэбных дысцыплін, незахаванне ў школах санітарна-гігіенічных нарматываў пры арганізацыі навучальнага працэсу, аб'ёмы хатніх заданняў, а можа быць, і арганізацыя той часткі дня, калі дзіця знаходзіцца па-за школай? Магчыма ў гэтым ёсць віна і самых бацькоў? І толькі калі мы прыйдзем да высновы, што для таго, каб зменшыць штодзённыя вучэбныя нагрузкі на дзяцей, іншага шляху, акрамя падаўжэння навучальнага года, не існуе, магчыма, мы і будзем такі варыянт разглядаць. Але падкрэслю, што такое рашэнне будзе прымацца выключна ў інтарэсах здароўя і адукаванасці дзяцей.

**— Аднак мне падаецца, што першапачатковая размова вялася пра павелічэнне ў штотыднёвым раскладзе гадзін на вывучэнне фізікі і матэматыкі, што павінна было пацягнуць за сабой аўтаматычна і падаўжэнне навучальнага года...**

> «Сёння месца настаўніка можа заняць, на жаль, кожны, хто мае дыплом, але стаць Настаўнікам з вялікай літары здольны далёка не ўсе».

— Для таго, каб дзеці лепш ведалі матэматыку ці фізіку, зусім неабавязкова падаўжаць навучальны год. Пад больш глыбокае вывучэнне гэтых дысцыплін павінны быць актыўна задзейнічаны школьныя факультатывы. Мяркую, што сістэма факультатываў выкарыстоўваецца ў нас сёння ў асноўным неэфектыўна. Несумненна, многае залежыць ад школы, канкрэтнага настаўніка і ад таго, як гэтыя факультатывы наведваюць школьнікі, але аналіз рэальнай эфектыўнасці факультатыўных заняткаў у большасці школ невысокі. Магчыма, прынцып добраахвотнасці ў гэтым плане выступае супраць нас. Да таго ж школьныя факультатывы — бясплатныя, а ўсё, што бясплатнае, чамусьці не выклікае вялікага даверу ў бацькоў. Таму, напэўна, і інстытут рэпетытарства ў іх асяроддзі такі запатрабаваны. Бацькі, якія жадаюць, каб іх дзеці паступілі на прэстыжную спецыяльнасць у прэстыжную ВНУ, гатовы за гэта плаціць. Лічу, што факультатывы павінны стаць годнай альтэрнатывай рэпетытарству. Калі дзіцяці для паступлення патрабуюцца больш глыбокія веды па матэматыцы, фізіцы, хіміі і гэтак далей, то мы павінны даць яму магчымасць атрымаць гэтыя веды.

Хачу дадаць, што ў гэтым навучальным годзе пытанні эфектыўнасці арганізацыі факультатыўных заняткаў будуць вывучацца падчас рэспубліканскага маніторынгу якасці адукацыйных паслуг, які праводзіць Нацыянальны інстытут адукацыі. Да таго ж сёлета падчас эксперыментальнай дзейнасці апрабуецца мадэль сістэмнага вывучэння факультатыўных заняткаў на базе дзевяці ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі Іванаўскага, Глыбоцкага раёнаў і горада Салігорска. Вынікі эксперыменту таксама дадуць падставы для прыняцця рашэння.

## Пра «першасортных» і «другасортных»...

**— А як вы ставіцеся да абвінавачанняў у тым, што з'яўленне навучальных устаноў новага тыпу падзяліла ўсіх дзяцей на «першасортных» і «другасортных», перспектыўных і не вельмі? Ёсць меркаванне, што такі «селекцыйны адбор» пазбаўляе вучняў звычайных сярэдніх школ стымулу да навучання. Ім проста няма на каго раўняцца...**

— Пытанні, безумоўна, ёсць. З іншага боку, статыстыка даказвае, што, для таго, каб атрымаць 100 балаў на цэнтралізаваным тэсціраванні, зусім неабавязкова быць выпускніком гімназіі ці ліцэя. Стобальнікі ёсць сярод выпускнікоў не толькі гарадскіх, але і сельскіх школ, хоць, пагадзіцеся, умовы для атрымання адукацыі ў іх крыху розныя. І рэпетытарства ў сельскай мясцовасці не развіта так, як у гарадах. Я асабіста абсалютна ўпэўнены, што галоўная ўмова для поспеху — не сам факт навучання ў гімназіі, а асоба настаўніка. А выдатныя настаўнікі, здольныя «заразіць» сваім прадметам, захапіць і павесці вучняў за сабой, сапраўдныя прафесіяналы ў сваёй справе, працуюць не толькі ў гімназіях. Сёння ў звычайных школах базавы кампанент у старшых класах складае 29 гадзін у тыдзень, а ў гімназіях — 32. Розніца — усяго тры гадзіны (з улікам профілю навучання). Можна паспрабаваць ліквідаваць гэтую розніцу зноў жа за кошт задзейнічання факультатываў, калі мы будзем бачыць, што нейкі кірунак у нас «правісае». А можа, трэба пайсці іншым шляхам: зрабіць на старшай ступені ўсе агульнаадукацыйныя ўстановы або гімназіямі, або ліцэямі. Базавая падрыхтоўка ва ўсіх установах адукацыі будзе аднолькавая, а на старшай ступені будзе рэалізавана ідэя прафілізацыі. Калі ў адной паралелі будзе, скажам, 8 класаў, то можна будзе рэалізаваць адразу некалькі профіляў навучання. Ці, скажам, адна ўстанова будзе філалагічная, а другая — фізіка-матэматычная. І дзеці будуць самі выбіраць, куды ім ісці навучацца.

**— А як вы ставіцеся да ўвядзення экзамену для ахвотных навучацца на старшай ступені школы? Пэўны час таму вы выказваліся супраць увядзення бар'ераў на ўваходзе ў 10 клас. Ці змянілася ваша стаўленне да гэтага пытання?**

— Я не супраць конкурснага адбору ў старшыя класы. Аднак я супраць таго, каб лішні раз траўмаваць дзяцей. Спачатку мы праводзім экзамены за курс базавай школы, затым будзем экзаменаваць ахвотных навучацца ў старшых класах школы. На выхадзе з агульнаадукацыйнай школы — зноў выпускныя экзамены. Пры паступленні — зноў экзамены. Мне здаецца, што прыняць рашэнне аб прыёме на старшую ступень школы трэба па выніках экзамену за курс базавай школы. Але гэты экзамен павінен быць нацыянальным, а не школьным. Навошта нам школьныя выпускныя экзамены? Цэлых дзевяць гадоў педагогі вучаць дзіця, выхоўваюць яго, атэстоўваюць, а потым сабраліся разам, каб яго праэкзаменаваць. Пра якую аб'ектыўнасць тут можа весціся гаворка? Ацэньванне павінна быць знешнім, а камісія — незалежнай, каб можна было потым супаставіць паспяховасць дзяцей з розных класаў, розных школ і розных рэгіёнаў. Але ў гэтым выпадку мы павінны дапамагчы школам падрыхтавацца да такіх экзаменаў: каб і патрабаванні былі загадзя вядомыя, і экзаменацыйныя матэрыялы... Добра было б, каб нейкая аўдытарская структура прыйшла ў школу за год ці за два да правядзення экзамену, правяла маніторынг і сказала: у вас адзнакі па той ці іншай дысцыпліне — добрыя, але будуць праблемы на экзамене, бо ведаў не хапае, каб і дырэктар, і настаўнікі, і вучні ведалі рэальную карціну, каб у бацькоў не было завышаных патрабаванняў. Мы павінны сказаць, што ўсе, хто атрымаў на выпускным экзамене, скажам, 7 балаў і больш (зразумела, па дзесяцібальнай шкале), змогуць вучыцца на старшай ступені школы, а ўсе, хто мае меншыя балы, павінны падумаць пра іншы адукацыйны маршрут. Нельга проста нанесці дзіцяці псіхалагічную траўму: дзіця не зразумее, чаму аднакласніка ўзялі ў 10 клас, а яго — не. Аднак, хачу падкрэсліць, што гэта пакуль толькі мае разважанні...

## Пра творчую самарэалізацыю...

**— Кожнаму творчаму і ініцыятыўнаму педагогу хоць аднойчы даводзілася чуць ад калег: «А навошта табе гэта патрэбна?» Як вы лічыце, ці можа такі педагог самарэалізавацца ва ўмовах звычайнай сярэдняй школы?**

— Упэўнены, што магчымасць творчай самарэалізацыі мае для педагога не меншае значэнне, чым яго матэрыяльнае заахвочванне. Можна, вядома, усё жыццё заставацца на адным узроўні і перастаць быць цікавым для вучняў, а можна ўвесь час узнімаць уласную планку прафесійнага майстэрства. Калі настаўнік перастае развівацца, то ні наяўнасць у яго вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, ні атрыманне ўсялякіх званняў не апраўдае яго перад уласнымі вучнямі. Настаўнік вышэйшай катэгорыі павінен быць і наватарам, і даследчыкам. Менавіта з гэтай прычыны мы палічылі, што наяўнасць вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі педагогам трэба пацвярджаць кожныя пяць гадоў. Палажэнне аб атэстацыі педагагічных работнікаў пакуль не зацверджана, тым не менш гэта норма ў ім дакладна ёсць.

> «Школьныя факультатывы — бясплатныя, а ўсё, што бясплатнае, чамусьці не выклікае вялікага даверу ў бацькоў»

Лічу, што сёння ў любога настаўніка і любога педагагічнага калектыву ёсць магчымасці для таго, каб распрацоўваць і рэалізоўваць свае інавацыйныя праекты, ствараць эксперыментальныя пляцоўкі. У нас у краіне ўжо не першы год дзейнічае клуб «Хрустальны журавель», які аб'ядноўвае ўдзельнікаў рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года». А з новага навучальнага года з'явілася і новая кваліфікацыйная катэгорыя «настаўнік-метадыст». Гэтая катэгорыя будзе прысвойвацца лепшым настаўнікам, якія маюць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю і аўтарскую методыку выкладання вучэбнага прадмета, зацверджаную Міністэрствам адукацыі.

**— Сяргей Аляксандравіч, адной з мэт эксперыменту па фінансаванні ўстаноў адукацыі было абвешчана прадастаўленне кіраўнікам навучальных устаноў больш шырокіх магчымасцяў і паўнамоцтваў па заахвочванні і стымуляванні настаўнікаў. Вы неаднойчы казалі, што грошы будуць ісці за вучнем. Але не зусім зразумела, як гэта будзе адбывацца на практыцы. Скажам, дзеці з усяго мікрараёна пажадаюць навучацца ў адной школе. А тая проста фізічна не зможа ўсіх прыняць. І педагогаў там элементарна на ўсіх не хопіць...**

— Упэўнены, што прынцып аплаты працы настаўніка па яе колькасці і якасці забяспечыць магчымасць аператыўна вырашаць кадравыя пытанні. Школы, куды будзе імкнуцца трапіць большасць дзяцей, змогуць прыцягнуць лепшых настаўнікаў, дзякуючы больш высокім заробкам. Трэба мець на ўвазе, што колькасць класаў не так уплывае на аб'ёмы фінансавання, як напаўняльнасць класаў. Чым больш дзяцей імкнуцца трапіць да канкрэтнага педагога, тым больш магчымасцяў для яго матэрыяльнага заахвочвання.

## Пра нарматыў фінансавання...

**— Аднак у Расіі набыццё школамі фінансавай самастойнасці пацягнула шэраг негатыўных момантаў, звязаных з прамым прымяненнем да сістэмы адукацыі законаў рынкавай эканомікі. Наступствам гэтага працэсу стала скарачэнне работнікаў галіны, перш за ўсё намеснікаў кіраўнікоў устаноў, выхавальнікаў груп падоўжанага дня, псіхолагаў, сацыяльных педагогаў, вучэбна-дапаможнага і абслуговага персаналу. У многіх расійскіх рэгіёнах увогуле адмовіліся ад груп падоўжанага дня. Іх стварэнне не ўвайшло ў нарматыў, як і павышэнне педагогамі кваліфікацыі.**

— Натуральна, усё залежыць ад таго, што будзе ўключана ў зацверджаны нарматыў фінансавання ў разліку на аднаго навучэнца. Магу дакладна сказаць, што ў нарматыў не будуць уваходзіць выдаткі на капітальны, бягучы рамонт, на набыццё абсталявання, камунальныя выдаткі і выдаткі на харчаванне навучэнцаў. А асноўную частку нарматыву (ад 90 да 96%) будуць складаць выдаткі на заработную плату. Як мы разважалі? Незалежна ад таго, колькі ў школе будзе навучацца дзяцей (500 ці 1,5 тысячы), будынак школы ўсё роўна трэба ўтрымліваць, ацяпляць, рамантаваць і гэтак далей. Таму было прынята рашэнне ўключаць у нарматыў толькі тыя выдаткі, ад якіх непасрэдна залежыць якасная арганізацыя адукацыйнага працэсу. Кіраўнік установы адукацыі разам са сваім калектывам будзе зацвярджаць крытэрыі, па якіх будзе ацэньвацца эфектыўнасць працы кожнага работніка.

> «Для таго, каб дзеці лепш ведалі матэматыку ці фізіку, зусім неабавязкова падаўжаць навучальны год»

**— Ёсць меркаванне, што сёння, каб узначаліць школу, трэба закончыць не адну ВНУ. Ёсць таксама думка, што дырэктары школ вымушаны выконваць менеджарскія функцыі, вымушаны пераарыентавацца на справаздачную работу, таму яны выпалі з рэальнага вучэбнага працэсу, перасталі наведваць урокі настаўнікаў. Вы з гэтым згодны?**

— Так, сёння дырэктар установы адукацыі — спецыяліст самага шырокага профілю. Ён павінен валодаць ведамі і ў галіне юрыспрудэнцыі, і ў галіне эканомікі. На яго плечы кладзецца шмат гаспадарчых і арганізацыйных спраў. А калі будзе запушчаны новы механізм фінансавання ўстаноў адукацыі, дырэктарам давядзецца стаць яшчэ і распараджальнікамі фінансаў. Натуральна, што магчымасцяў для таго, каб асабіста ўдзельнічаць у адукацыйным працэсе, у дырэктараў школ застаецца ўсё менш. Але мне здаецца, што дырэктар усё ж такі павінен знаходзіць час для таго, каб дакладна ведаць, як працуе той ці іншы яго настаўнік, як ставяцца да педагога вучні і іх бацькі. З якімі праблемамі яму даводзіцца сутыкацца штодня. Але для гэтага дырэктар школы павінен, падкрэслю, бываць на ўроках. У педагагічных ВНУ ў нас сёння і сапраўды дырэктараў школ не рыхтуюць. Але ёсць курсы павышэння кваліфікацыі. А ў гэтым годзе адкрылася практыка-арыентаваная магістратура па падрыхтоўцы менеджараў у адукацыі, з улікам міжнароднага досведу.

## Пра свядомы выбар...

**— Між іншым, расіяне сёння задумаліся ўжо над адкрыццём для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцяў інтэрнатуры (накшталт інтэрнатуры для будучых медыкаў) і ўвядзення экзамену на прафесійную прыдатнасць, паколькі не ўсе маладыя людзі, якія выбіраюць педагагічныя спецыяльнасці, могуць і гатовы працаваць з дзецьмі...**

— Варыянт з інтэрнатурай — вельмі слушны. Калі ты не педагог па сваёй сутнасці, па сваім прызванні, то ў школу лепш не ідзі. У нас няма патрэбы ў тым, каб кожны, хто паступіў на педагагічную спецыяльнасць, абавязкова ішоў працаваць у школу. Безумоўна, нам бы хацелася, каб выбар абітурыентамі сваёй будучай прафесіі рабіўся свядома, каб кожны выпускнік педагагічнай ВНУ станавіўся добрым настаўнікам. Але, напэўна, гэта немагчыма. Я лічу, што лепш менш, ды лепш. Не кожны можа быць настаўнікам. Настаўнік — гэта прафесія ад Бога. Можна цудоўна ведаць свой прадмет, але гэтага для работы ў школе недастаткова. Дыплом такім выпускнікам трэба выдаваць, але не для работы ў школе.... Сёння месца настаўніка можа заняць, на жаль, кожны, хто мае дыплом, але стаць Настаўнікам з вялікай літары здольныя далёка не ўсе...Таму напярэдадні Дня настаўніка я хацеў бы павіншаваць усіх педагогаў, якія дзень за днём, год за годам робяць усё для таго, каб выхаваць не спажыўцоў, а творцаў — людзей, якія будуць рухаць наперад нашу краіну, нашу эканоміку, нашу навуку, і падзякаваць ім за іх нялёгкую штодзённую працу.

**Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.**

# БЫЦЬ ВЕТУРАЧОМ — ГЭТА ЦІКАВА,
## або Практыка — з першых гадзін

Антон Іванавіч ЯТУСЕВІЧ, доктар ветэрынарных навук, прафесар, узначальвае Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны з 1998 года. У лютым выбраны акадэмікам Расійскай акадэміі сельскагаспадарчых навук. Акрамя таго, не так даўно скарбонка высокіх узнагарод Антона Іванавіча папоўнілася яшчэ і залатым медалём імя Вавілава. Шчыра віншуем з новымі асабістымі дасягненнямі, якія павышаюць аўтарытэт акадэміі за межамі нашай краіны!



Рэктар Антон ЯТУСЕВІЧ.

**Установа адукацыі «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны» — адна са старэйшых і вядучых ВНУ нашай краіны па падрыхтоўцы ўрачоў і правізараў ветэрынарнай медыцыны, ветэрынарна-санітарных урачоў і заоінжынераў.** Ільвіная доля ўвагі ў акадэміі надаецца практычнай падрыхтоўцы студэнтаў: яна займае каля 50 % (!) вучэбнага часу. Першыя клінічныя навыкі будучыя спецыялісты атрымліваюць на практычных занятках у 7 клініках акадэміі, дзе за навучальны год 700—900 хворых жывёл праходзяць стацыянарнае лячэнне і амаль 2000 прымаюцца амбулаторна.

— Немагчыма падрыхтаваць добрага спецыяліста без практыкі, — перакананы **першы прарэктар па навуковай рабоце, доктар біялагічных навук, прафесар Аляксандр СУБОЦІН.** — Менавіта таму кароў, свіней, коней, авечак, якіх вязуць з усіх рэгіёнаў Беларусі і з бліжэйшых абласцей Расіі, кошак, сабак, хамякоў, якіх прыносяць на прыём гараджане, выкладчыкі абследуюць разам са студэнтамі. Такім чынам навучанне ідзе не на пальцах ці манекенах, а на практыцы. Само ж лячэнне таксама шчыльна выкарыстоўваецца ў навучальным працэсе. За кожным чатырохногім пацыентам замацоўваецца 2-3 кураратары з ліку студэнтаў. Штодзень яны абколваюць яго прызначаным прэпаратам, праводзяць фізіяпрацэдуры, вымяраюць пульс, складаюць тэмпературныя графікі. Пасля на падставе гэтых назіранняў пішацца курсавая работа па пэўнай дысцыпліне.



Першы прарэктар Аляксандр СУБОЦІН.

Па-максімуме выкарыстоўваюцца ў сценах акадэміі і дасягненні тэхнічнага прагрэсу.

— Падчас складанай аперацыі ў аперацыйную шмат студэнтаў не змесціцца, а калі і змесціцца, то яны нічога не ўбачаць, — распавядае **загадчык кафедры агульнай, прыватнай і аператыўнай хірургіі Эдуард ВЕРАМЕЙ.** — Таму купілі плазменны экран, у аперацыйнай усталявалі камеру і вядзём адтуль прамую трансляцыю. Такім чынам студэнты адразу 2-3 груп маюць магчымасць, седзячы ў аўдыторыі, назіраць за кожным рухам рукі, іголкі, пінцэта. Пры гэтым усе маніпуляцыі каментуюцца выкладчыкам. Прыязджалі да нас студэнты з Германіі і здзівіліся, бо ў іх дапускаюць студэнтаў да аперацыі толькі праз шкло ці праз тэлевізар. Мы ж дапускаем сваіх на аперацыю і ў якасці асістэнтаў.

Зрэдку на прыём у клініке акадэміі паступаюць і такія экзатычныя жывёлы, як дэльфіны, страусы. Вядзецца догляд і насельнікаў (тхор, пітон, чарапахі, скарпіёны і інш.) віварыя, які маецца пры кафедры заалогіі. Музей выкарыстоўваецца як для заняткаў, так і для навукова-практычнай дзейнасці студэнтаў. А яшчэ гэта папулярнае месца ў экскурсійным плане. Заходзяць сюды школьнікі, якім яшчэ трэба выбіраць сабе прафесію.

На базе перадавых аграпрамысловых прадпрыемстваў, якія месцяцца ў Віцебску і ў вобласці, акадэмія мае 40 філіялаў. Там абсталяваны класы для заняткаў студэнтаў. Пасля таго, як у класе будзе засвоена тэарэтычная частка, яна тут жа замацоўваецца на практыцы. У адзін з такіх філіялаў, што на базе Віцебскага мясакамбіната, мы і наведаліся на занятак па акушэрству.

— Тут праходзяць заняткі не толькі нашай кафедры, але і кафедры хірургіі, ветсанэкспертызы, — распавядае **дацэнт кафедры акушэрства Юрый РЫБАКОЎ.** — Тут мы ў асноўным працуем з буйной рагатай жывёлай. Мы ўдзячны кіраўніцтву мясакамбіната, што нас сюды пускаюць, ідуць нам насустрач, даюць матэрыялы для адпрацоўкі акушэрскай паталогіі, даюць магчымасць працаваць на клінічных жывёлах. Я 15 гадоў выкладаю і бачу, як мясакамбінат клапоціцца пра нашых студэнтаў. Зрабілі рамонт: купілі мэблю, усталявалі ўмывальнікі, каб студэнту пасля заняткаў можна было памыцца, пераапрануцца.

Замацоўваюцца атрыманыя веды на вытворчай практыцы ў ветэрынарных станцыях і лабараторыях, перадавых гаспадарках рэспублікі, а таксама за мяжой. Студэнты маюць магчымасць праходзіць стажыроўку ў 12 краінах свету, у тым ліку Польшчы, Германіі, Англіі, ЗША, Канадзе, Швецыі і іншых. На выпускных курсах уведзены экзамен па практычных навыках.



Загадчык кафедры агульнай і аператыўнай хірургіі Эдуард ВЕРАМЕЙ.



Ветурач мясакамбіната Андрэй СПІРЫДОНАЎ знаёміць студэнтаў акадэміі Надзею ЕМЕЛЬЯНЕНКА, Івана ВІЛЬКІЦКАГА і Яраславу СЕМІХАТАВУ са спосабамі выкарыстання дазіметрычных прыбораў падчас выязных практычных заняткаў.

### Гутарка з рэктарам

**— Афрыканская чума, свіны і птушыны грып... У Расіі і іншых краінах практычна штогод назіраюцца ўспышкі гэтых хвароб. Нас жа, дзякуй Богу, небяспечныя эпідэміі мінаюць...**

— Так, не сакрэт, што цяпер у Расіі лютуе афрыканская чума, зафіксавана ажно 118 ачагоў. У прыватнасці, у Цвярской вобласці вымушаны былі спаліць больш за 100 тысяч свіней. Ды што там казаць, нават у цывілізаванай Англіі на шаленства захварэла і было знішчана 3 мільёны кароў. Нашы вучоныя не стаяць убаку ад такіх праблем. Пры акадэміі ёсць навукова-даследчы інстытут, перад якім, як толькі з'яўляецца нейкая новая хвароба, ставіцца задача знайсці сродкі абароны. Разам з тым гэтыя насцярожвальныя факты прымушаюць нас думаць пра тое, каб павялічваць колькасць выпускнікоў. Так, сёлета ўзялі на 30 першакурснікаў больш, чым летась. Стараемся максімальна забяспечыць аграпрамысловы комплекс выдатнымі спецыялістамі.

**— Можна сказаць, што ў Беларусі, у адрозненне ад іншых дзяржаў, найбольш арганізавана ветэрынарная служба?**

— Гэта так і ёсць. Бо мы не пайшлі на ўсемагчымыя эксперыменты, захавалі жорсткія рэжымы на жывёлагадоўчых прадпрыемствах. Урад за апошнія некалькі гадоў двойчы вяртаўся да «Закона аб ветэрынарнай дзейнасці». У распрацоўцы апошняга варыянта ўдзельнічаў і я, там закладзена вялікая фінансавая падтрымка на прафілактыку хваробы, актыўнае развіццё фармацэўтычнай дзейнасці. Згодна з законам, вызначаны асобныя людзі, якія будуць займацца выключна кантролем якасці жывёлагадоўчай прадукцыі.

**— У сувязі з гэтым вы і адкрылі дзве новыя спецыяльнасці — «Ветэрынарная санітарыя і экспертыза» і «Ветэрынарная фармацыя»?**

— Ветэрынарна-санітарная экспертыза прадукцыі жывёлагадоўлі проста неабходная, бо каля 200 хвароб агульныя ў чалавека і жывёл. Хваробы могуць перадавацца ў тым ліку і праз няякасныя прадукты. Што ж тычыцца ветэрынарных фармацэўтаў, то нідзе, акрамя нас, на постсавецкай прасторы іх не рыхтуюць. Калі ў 1990 годзе ў нас выраблялася 10% айчынных ветпрэпаратаў для лячэння жывёл, то цяпер мы выйшлі на 70-80%. Вялізныя сродкі эканомяцца для дзяржавы. Гаворка ідзе аб мільярдах долараў. У нас за 3 гады 150 прэпаратаў распрацавана і перададзена беларускім вытворцам. Асобныя прэпараты нават за межамі не маюць аналагаў.

**— Праўда, што на базе акадэміі з'явіцца свая вытворчасць ветпрэпаратаў?**

— Ёсць такая мара. Ужо з гэтага года плануем запусціць доследна-эксперыментальную вытворчасць ветфармпрэпаратаў. Бо адна справа – бясплатна перадаваць дакументы на выраб прэпаратаў, іншая — вырабляць самастойна. Тым больш што ў нас ёсць ліцэнзія на вытворчасць і продаж, свая аптэка. Ужо і памяшканне знайшлі пад гэтыя мэты, і некалькі новых прыбораў закупілі.

**— Падзяліцеся іншымі планамі на перспектыву.**

— У планах будаўніцтва яшчэ аднаго інтэрната і новага вучэбнага корпуса, бо колькасць студэнтаў расце. Калі некалькі гадоў таму ў нас было 3 тысячы студэнтаў, то цяпер у акадэміі навучаецца каля 6000 студэнтаў разам з завочнікамі. Гэта грамадзяне нашай краіны, Туркменістана, Расіі, Кітая, Украіны, Азербайджана, Самалі, Лівана, Сірыі, прыбалтыйскіх краін і г.д. Для іх створаны ўсе ўмовы як для тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі, так і побыту. Забяспечанасць інтэрнатамі ў нас амаль 100%. ***З гэтага года, каб прыцягнуць замежных студэнтаў, плануем забяспечыць кожную кафедру 1-2 выкладчыкамі, якія б вялі заняткі на англійскай мове. Гэта павялічыць даступнасць адукацыі.***

**— Вы падчас аднаго з інтэрв'ю гаварылі, што на кожнага выпускніка акадэміі прыходзіцца па 3-4 запыты ад гаспадарак. Ці захавалася сітуацыя?**

— Попыт на нашых спецыялістаў заўсёды вялікі быў, ёсць і будзе. Пра гэта сама міністр працы і сацыяльнай абароны казала (цытуе): «На 359 вакансій ветурача ў рэспубліканскім банку вакансій прыпадае 7 беспрацоўных. Гэта значыць прапанова на пасаду перавышае попыт у 51,3 раза». Дэфіцыт спецыялістаў вялікі, хоць рыхтуем мы іх дастаткова, я кажу за ўсю аграрную адукацыю. На сёння праблема — іх замацоўванне. Пасля двух гадоў працы не ўсе застаюцца на месцах, куды трапілі па размеркаванні. Маладыя спецыялісты прыжываюцца ў асноўным у моцных гаспадарках, дзе добрыя заробкі, належнае жыллё, інфраструктура.

**— Паводле слоў прафесара Субоціна, прафесія ветурача вельмі перспектыўная: на трэцім месцы па аплачвальнасці ў Еўропе пасля юрыстаў і нейрахірургаў.**

— Лячэнне жывёл — асабліва хамячкоў, коцікаў ды сабачак — дорага каштуе. Гаспадар сабе часам на лекі пашкадуе, але не для свайго гадаванца. Па-другое, ветурач не толькі лечыць. Я ўжо казаў пра значнасць кантролю якасці прадуктаў харчавання. Нашы выпускнікі паўсюль — і на рынку, і на мясакамбінаце. Недарэмна кажуць, што ўрач лечыць чалавека, а ветэрынар — чалавецтва. Таму прафесія перспектыўная і дастаткова высокааплатная. Іншая справа, што ў Беларусі, у адрозненне ад замежных краін, недастаткова ветклінік. На кожныя 10 тысяч насельніцтва па міжнародных законах павінна быць ветклініка з поўным наборам спецыялістаў: тэрапеўт, гінеколаг, паразітолаг, хірург і інш. У Віцебску ж на тры адміністрацыйныя раёны ўсяго адна гарадская ветэрынарная станцыя. Таму нам ёсць да чаго імкнуцца.

* * *

Сёння цяжка знайсці гаспадарку, у якой бы не працавалі выпускнікі Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Сярод найбольш вядомых — губернатар Гомельскай вобласці Уладзімір Дворнік, былы міністр сельскай гаспадаркі Леанід Русак, рэктар БДАТУ Мікалай Казаравец, рэктар Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі Аляксандр Курдэка і многія іншыя.

— І за мяжой нашы спецыялісты высока цэняцца, — з гонарам дадаў рэктар. — Куды б не заехалі, паўсюль іх з задавальненнем бяруць на працу. Бо наш дыплом Пастаянная камісія Міністэрства адукацыі Германіі прызнала адпаведным патрабаванням Еўрасаюза. А гэта, несумненна, вынік працы высокакваліфікаванага калектыву акадэміі.

**Выпускнікоў ветэрынарнай акадэміі прызнаюць і ў Еўрасаюзе**

**Спецыяльнасць урача ветэрынарнай медыцыны, атрыманую на базе Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, Пастаянная камісія Міністэрства адукацыі Германіі прызнала цалкам адпаведнай патрабаванням Еўрапейскага саюза.**



Практычныя заняткі вядзе дацэнт кафедры Валянціна МАСЮКОВА.

**Яўген ЮШКОЎСКІ, адказны сакратар прыёмнай камісіі:**

— Казаць, што дзённая прыёмная кампанія скончылася, крыху рана. Да 15 кастрычніка прымаем замежных грамадзян. Калі ж казаць пра беларускіх абітурыентаў, то, нягледзячы на тое, што сёлета зменшылася колькасць выпускнікоў школ, мы дастаткова паспяхова ўкамплектаваліся. На першы курс стацыянара прынялі 611 чалавек, у тым ліку на платную форму навучання — 131. Самы высокі конкурс сярод беларускіх абітурыентаў быў на спецыяльнасці «Ветэрынарная санітарыя і экспертыза» і «Ветэрынарная фармацыя», адпаведна 2,2 і 2,6 чалавека на месца.

З 1 лістапада пачнецца завочная прыёмная кампанія. Традыцыйна будзем набіраць студэнтаў на спецыяльнасці ветэрынарная медыцына, заатэхнія, заатэхнія НІСПА і дзяржаўнае кіраванне і эканоміка. У Рэчыцы і Пінску ёсць філіялы акадэміі, дзе можна падаць дакументы на ўсе вышэйпералічаныя спецыяльнасці, акрамя дзяржаўнага кіравання і эканомікі. Плата адносна невысокая ў параўнанні з іншымі ВНУ — прыкладна 2 млн 500 тыс. за год.

**Матэрыялы падрыхтавалі Надзея ДРЫЛА, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

УНП 300002681

# ПАЧЫНАЕЦЦА З ЛЮБВІ...

**Знаёмая расказала па цяперашнім часе амаль дзіўны выпадак. Яе сын, як і многія гарадскія дзеці, не вельмі ахвотна вучыў беларускую мову ў школе, ледзь-ледзь валодаў ёю. А калі паступіў у 10 клас абласнога ліцэя, стаўленне да прадмета істотна перамянілася. Ну ніяк не чакалі бацькі, што тэсціраванне сын будзе здаваць па беларускай, а не па рускай мове. Юнак вытрымаў тэсты паспяхова і зараз вучыцца ў тэхнічным універсітэце.**



Наталля Мікалаеўна ДУБРОЎСКАЯ.

— Такіх прыкладаў у нас процьма, — смяецца Наталля Мікалаеўна Дуброўская, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Брэсцкага абласнога ліцэя імя П.М. Машэрава. — Наша задача — дастукацца да сэрцаў, пераканаць маладых людзей, што іх трывалыя веды будуць служыць у будучым ім, іх сем'ям, а таксама роднай краіне, як і данесці тое, што без ведання сваіх каранёў, мовы, культуры чалавек — духоўна бедны.

Часта на першым уроку яна расказвае вучням гісторыю, якую даўно прачытала ў Расула Гамзатава. — Вядомы паэт неяк гасцяваў у Францыі. І выпадкова сустрэў там земляка — аварца. Той шчыра запрасіў земляка дадому. Пазнаёміў са сваёй сям'ёй. Расказаў, як занесла яго ў чужую краіну ў ранняй маладосці, як ажаніўся з француженкай, выгадаваў дзяцей, дачакаўся ўнукаў. Выязджаў ён пасля рэвалюцыі, і сувязяў з таго часу з аварскай сям'ёй не меў... Калі паэт вярнуўся дадому, ён найперш адшукаў вёску новага знаёмца. О, дзіва! — там жыла старэнькая маці эмігранта. «Я прынёс табе цудоўную вестку, — сказаў Расул Гамзатаў жанчыне. — Твой сын жывы, у яго добрыя дзеці, цудоўныя ўнукі». І доўга распавядаў пра французскую сям'ю былога аварца. Яна ўважліва слухала, а потым спытала: а як жа вы разумелі адзін аднаго? «Праз перакладчыка», — адказаў паэт. Тады жанчына выняла з шафы чорную хустку, завязала яе і сказала: «Ты прынёс мне дрэнную вестку, чалавек. Мой сын памёр для мяне, калі ён забыўся сваю мову».

Гэтую гісторыю дзеці звычайна слухаюць вельмі ўважліва, — кажа Наталля Мікалаеўна. Каб трымаць іх увагу, у яе ў запасе яшчэ шмат розных гісторый, як і спосабаў абудзіць думку, выклікаць патрэбу спасцігаць родную мову, літаратуру, наганяць прапушчанае.

Адно з галоўных ліцэйскіх мерапрыемстваў — фестываль беларускай культуры, якое праводзіцца ў навучальнай установе раз у два гады. Такім чынам, у фэсце ўдзельнічае кожны выпуск. Завадатарамі выступаюць абедзве настаўніцы роднай мовы — Наталля Дуброўская і Лідзія Рабчынская, але справу падхопліваюць усе педагогі. Бо мерапрыемства сапраўды становіцца падзеяй у школьным жыцці. Галоўнае, што вучні ўсё робяць самі: пішуць сцэнарыі, рыхтуюць спектаклі, выпускаюць газеты, прыдумваюць забаўкі. Нават на перапынках у той фестывальны тыдзень у калідорах гучыць музыка, і замест фізкультмінуткі хлопцы з дзяўчатамі выконваюць «Лявоніху» ды іншыя беларускія танцы. У настаўніцкай можна паглядзець відэазапіс мерапрыемстваў розных гадоў. І галоўнае, на што нельга не звярнуць пры гэтым увагу — агеньчык у вачах дзяцей, адухоўленыя твары. І гэта самае важнае, лічаць педагогі. А праграма раз ад разу мяняецца, бо кожны раз яе складаюць новыя аўтары.

Наталля Дуброўская часта гаворыць выхаванцам, што ёсць два шляхі вывучэння пэўнай тэмы. І вучні самі выбіраюць той ці іншы. Так атрымліваецца цікавей. А дапамагае настаўніцы, вядома, яе багаты вопыт. У маладосці яна працавала ў ПТВ горада Чачэрска. Там часта траплялiся зусім слабыя вучні. Таму важна было іх не запалохаць адразу, пачынаць не з глыбокіх, а з нейкіх вельмі простых рэчаў. «Кажу ім: паглядзіце, як гэта лёгка і проста. Засвояць адно, паступова пераходзім да іншага», — згадвае педагог. Пасля пераезду ў Брэст доўгі час працавала ў школе № 35, потым запрасілі ў ліцэй. Тут дзеці, як правіла, больш падрыхтаваныя. Яны самі праяўляюць ініцыятыву, знаходзяць нешта новае, скажам, у інтэрнэце. Важна накіраваць іх, зарыентаваць. Паводле пераканання настаўніцы, з імі цікава ладзіць сустрэчы з паэтамі, пісьменнікамі, навукоўцамі. А такія імпрэзы тут сталі пастаяннымі.

Сярод вучняў Наталлі Мікалаеўны нямала пераможцаў розных этапаў прадметных алімпіяд. Не дзіўна, што многія выпускнікі становяцца студэнтамі філалагічных факультэтаў ВНУ краіны. А летась, калі быў аб'яўлены Міжнародны конкурс вучнёўскіх работ да 25-годдзя чарнобыльскай трагедыі, вучні стварылі сцэнарый рэквіема «Трэба жыць» на беларускай мове. І атрымалі адзнаку лаўрэатаў. На гэтым жа конкурсе вучаніца 11-га класа Наталля Каўпанька, зараз студэнтка філфака, за эсэ «Дарога ў храм» таксама была адзначана ўзнагародай.

Сама настаўніца з 36-гадовым стажам на пытанні пра складнікі свайго поспеху пасля хвіліннага роздуму заўважае, што, па-першае, ёй пашчасціла працаваць у калектыве аднадумцаў. Гэта вялікая справа па цяперашнім часе. Калі б не было магчымасці працаваць творча, праводзіць у жыццё свае невялікія эксперыменты, нічога не атрымалася б. Ды і дзякуе Богу за тое, што дараваў ёй любоў да сваёй справы. Без гэтага, відаць, даўно збегла б са школы.

Дырэктар ліцэя Ніна Альхіменка заўважыла, што ў сваім водгуку ёй нават няёмка раздзяляць настаўніц роднай мовы Наталлю Дуброўскую і Лідзію Рабчынскую. Бо працуюць яны ў адной звязцы, абедзве апантаныя сваёй справай, разам нясуць у дзіцячыя душы любоў да роднага слова.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# БРОНЗАВЫ ВЕТУРАЧ З'ЯВІЦЦА Ў ВІЦЕБСКУ

**У дворыку вучэбна-лабараторнага корпуса Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны ўстанаўліваюць помнік ветурачу. Пра гэта «Звяздзе» паведаміў рэктар гэтай навучальнай установы Антон ЯТУСЕВІЧ.**



Бронзавы Айбаліт са стэтаскопам на шыі выкананы ў натуральны рост вядомым віцебскім скульптарам Іванам Казаком. У левай руцэ лекара — скрутак з надпісам «Ветэрынарная медыцына засцерагае чалавецтва». Кампазіцыю дапоўняць і «браты нашы меншыя» — сабака, цяля і папугай, якія размесцяцца ля свайго доктара. Помнік, створаны на грошы выкладчыкаў і студэнтаў акадэміі, стане віцебскім сімвалам гэтай гуманнай прафесіі. Цяпер актыўна вядуцца падрыхтоўчыя работы да ўстаноўкі кампазіцыі на пастамент, выраблены з мармуру і граніту. Як толькі яны будуць завершаны, адбудзецца ўрачыстае адкрыццё помніка. Як плануецца, яно будзе прымеркавана да важнай падзеі ў жыцці ВНУ — пасвячэння першакурснікаў у студэнты, якое традыцыйна прыпадае на лістапад.

**Надзея ДРЫЛА.**

■ Ва ўсіх на слыху

Аляксандр БОЙКА:

# «Кваліфікацыйная катэгорыя — гэта не проста частка іміджу педагога»



**«Я абсалютна ўпэўнены, што «вышэйшы пілатаж» у педагогіцы павінен заахвочвацца», — заявіў на апошняй сустрэчы з журналістамі старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА. Падчас абмеркавання праекта Інструкцыі аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў на прысваенне ім кваліфікацыйных катэгорый пазіцыя галіновага прафсаюза была прынцыповая: нарматывы надбавак за наяўнасць кваліфікацыйных катэгорый трэба павялічваць у 3—4 разы — для стымулявання настаўнікаў да павышэння свайго прафесійнага ўзроўню.**

— Сёння розніца ў заробках педагогаў першай і другой катэгорыі зусім нязначная, — патлумачыў журналісту «Звязды» Аляксандр БОЙКА. — Так, за наяўнасць другой кваліфікацыйнай катэгорыі настаўнікі атрымліваюць надбаўку ў памеры 15% ад тарыфнай стаўкі, за першую — 20% і вышэйшую — 30%. Але кваліфікацыйная катэгорыя павінна не проста быць часткай іміджу педагога, а адлюстроўваць яго прафесійнае майстэрства, якасць адукацыі, гарантаваць педагогу адпаведны ўзровень заробкаў. Пакуль такога, на жаль, няма. Салідарная ў гэтым пытанні пазіцыя Міністэрства адукацыі і галіновага прафсаюза яшчэ не знайшла адлюстравання ў заканадаўстве з-за абмежаванасці бюджэтных рэсурсаў.

На прайшоўшым у чэрвені пленуме ЦК галіновага прафсаюза міністр адукацыі Сяргей Маскевіч ахарактарызаваў прафсаюз як своеасаблівы матор, які рэалізуе ў сістэме адукацыі інавацыі, перш за ўсё ў пытаннях сацыяльнай абароны работнікаў і навучэнцаў. Менавіта на гэтым пленуме прафсаюз і міністэрства, як сацыяльныя партнёры, прыйшлі да адзінай пазіцыі: сёння, зыходзячы з даручэнняў Прэзідэнта краіны, трэба перагледзець у галіне адукацыі сістэму матэрыяльнага стымулявання педагагічных работнікаў, вызначыўшы крытэрыі, якія павінны базіравацца ў першую чаргу на эфектыўнасці іх работы. Але перагляд магчымы пры дасягненні такога базавага ўзроўню аплаты працы, калі стымуляванне перастане быць латаннем дзірак у заробках. У апошнія гады ў гэтым кірунку былі зроблены істотныя крокі: заробкі педагогаў пастаянна раслі. Але на фоне інфляцыйных працэсаў гэтыя заваяванні, на жаль, дэвальвуюцца. Мы пакуль так і не змаглі выйсці на ўзровень заробкаў, які быў у галіне напрыканцы 2010 года...

**— Аляксандр Аляксандравіч, на тым жа пленуме вялася размова пра яшчэ адну актуальную праблему: усё менш маладых людзей хочуць працаваць у школе...**

— Сапраўды, у пачатку навучальнага года вучням нярэдка даводзіцца тлумачыць, чаму іх любімы настаўнік змяніў месца працы. Асабліва часта з устаноў адукацыі сыходзяць маладыя педагогі, бо пасля завяршэння работы па размеркаванні малады педагог ужо страчвае статус маладога спецыяліста: яго заработная плата становіцца меншай, паколькі ён ужо не мае права на даплату ў памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду і не ажыццяўляецца 10-працэнтнае павышэнне тарыфнай стаўкі. Гэтую розніцу не можа ліквідаваць нават прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі. Упэўнены, што надбаўка за наяўнасць другой катэгорыі, напэўна, усё ж такі павінна гарантаваць больш высокі памер заработнай платы ў параўнанні з заробкамі маладых спецыялістаў. Пакуль жа, як я ужо казаў, адпаведныя прапановы не знайшлі падтрымку ў Міністэрстве фінансаў.

**— Але для вырашэння кадравых праблем у сістэме адукацыі застаецца яшчэ адзін магутны рэсурс — мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў...**

**Патрэба ў маладых спецыялістах ёсць, і сістэма педагагічнай адукацыі ў стане іх падрыхтаваць. Але галіна ў сілу розных прычын не ў стане іх утрымліваць.**

— Павелічэнне тэрмінаў абавязковай адпрацоўкі для «мэтавікоў» адпужвае вельмі многіх. Да таго ж ёсць недаборы нават на бюджэтную форму навучання будучых матэматыкаў, фізікаў і філолагаў. Па выніках нашага маніторынгу, у галіне не хапае настаўнікаў матэматыкі, інфарматыкі, фізікі, хіміі, замежных моў, выхавальнікаў, памочнікаў выхавальнікаў, кіраўнікоў па фізічным выхаванні, педагогаў дадатковай адукацыі, метадыстаў, кухонных работнікаў, абслуговага персаналу. Усё часцей да работы прыцягваюцца педагогі пенсійнага ўзросту. Яны складаюць каля 9% ад агульнай колькасці настаўнікаў, і гэты паказчык у апошнія гады расце. Патрэба ў маладых спецыялістах ёсць, і сістэма педагагічнай адукацыі ў стане іх падрыхтаваць. Але галіна ў сілу розных прычын не ў стане іх утрымліваць.

**— А як ставіцца прафсаюз да ўкаранення новай сістэмы фінансавання ўстаноў адукацыі з разліку на аднаго навучэнца?**

— Для таго, каб быць гатовымі да работы ў новых умовах, мы стварылі рабочую групу па вывучэнні ўдасканалення механізму фінансавання ўстаноў адукацыі і магчымага пераходу на новую сістэму аплаты працы педагагічных работнікаў. Члены рабочай групы выязджалі ў Расійскую Федэрацыю — у прыватнасці, вывучалі досвед работы калег з Масквы, Маскоўскай, Бранскай і Смаленскай абласцей, паколькі размова ідзе пра ўкараненне «падушавой» сістэмы аплаты працы накшталт той, што ўжо дзейнічае ў Расіі, дзе грошы ў выглядзе ваўчара прывязваюцца да канкрэтнага дзіцяці. На думку членаў рабочай групы ЦК, новая сістэма фінансавання, што дзейнічае ў Расійскай Федэрацыі, мае шэраг недахопаў. Падушавы нарматыў там значна адрозніваецца ў залежнасці ад рэгіёна, ад тыпа ўстановы, яе «геаграфіі» і напаўняльнасці. Адпаведна, і розніца ў заробках настаўнікаў (скажам, у Маскве і на Смаленшчыне) вельмі істотная. Пры тым, што педагогі выконваюць адну і тую ж работу. Мы дакладна разумеем, што новая сістэма фінансавання будзе станоўча ўспрынята грамадскасцю толькі ў выпадку павелічэння фінансавання, гэта значыць, фарміравання нарматыву, зыходзячы з рэальных патрэб школ.

Нарматыў павінен уключаць складнікі як навучання, так і выхавання, у тым ліку наяўнасць адпаведных штатных адзінак (педагогаў-псіхолагаў, сацыяльных педагогаў, педагогаў-арганізатараў), правядзенне факультатыўных, гуртковых і іншых заняткаў, стварэнне груп падоўжанага дня. Нарматывам таксама павінны быць улічаны тыповыя штаты, дзеючая сістэма аплаты працы, матэрыяльнае стымуляванне, матэрыяльная дапамога ў адпаведных аб'ёмах, неабходнасць павышэння кваліфікацыі, уключаючы атэстацыю і перападрыхтоўку кадраў.

Трэба стварыць такі механізм фарміравання нарматыву, які быў бы арыентаваны на ўдасканаленне кваліфікацыйнага ўзроўню настаўнікаў, прыцягненне ў калектывы высокакваліфікаваных кадраў і маладых спецыялістаў. Такім чынам, нарматыў павінен разлічвацца з улікам адпаведнага кваліфікацыйнага ўзроўню настаўнікаў. Неабходна таксама дакладна вызначыць рамкі самастойнасці ўстаноў адукацыі, якія задзейнічаны ў эксперыменце, і паўнамоцтвы іх кіраўнікоў. І, бадай што самае галоўнае, узровень аплаты працы работнікаў устаноў, задзейнічаных у эксперыменце, не павінен быць меншым, чым дасягнуты.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## КАБ ПАМЯТАЛІ

**У сярэдняй школе № 2 горада Чавусы Магілёўскай вобласці адкрылася мемарыяльная дошка памяці настаўніка Рыгора Фёдаравіча Самойлава.**

Рыгор Самойлаў — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, які дайшоў да Берліна, а ў мірны савецкі час працаваў у школе настаўнікам выяўленчага мастацтва і чарчэння, стаў заслужаным настаўнікам БССР. Сярод яго вучняў — беларускія мастакі, вядомыя ў краіне, і людзі іншых прафесій. Настаўнік таксама вёў гурток разьбы па дрэве ў дзіцячым доме Чавусаў. Рыгора Фёдаравіча даўно няма, але яны памятаюць свайго добрага настаўніка. Вось і вырашылі зрабіць за свае сродкі мемарыяльную дошку, якая ўсталявана на будынку школы № 2 і сёння ўрачыста адкрываецца.

— Да нас прыедуць мастакі з Мінска і Магілёва, — расказала напярэдадні дырэктар школы № 2 Наталля Кірпічова. — Гэта стане першым крокам у нашай працы па захаванні памяці пра нашых настаўнікаў і іх знакамітых вучнях.

**Ілона ІВАНОВА.**


**Шаноўныя калегі!**
**Шчыра віншую вас з прафесійным святам!**
**Няма задачы больш высакароднай, чым даваць веды, рыхтаваць дзяцей і моладзь да жыцця ў грамадстве.**
**Наша дзейнасць у далейшым павінна быць скіравана на ўмацаванне прэстыжу прафесіі, развіццё адукацыі.**
**Таму няхай заўсёды нам спадарожнічае аптымізм.**
**Моцнага ўсім здароўя і дабрабыту, цярпення і мудрасці, творчых дасягненняў і ўдзячных вучняў!**
*Рэктар Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Пётр ПОЙТА.*
УНП 200002511


■ Ліст з канверта

# Усім, каму імя НАСТАЎНІК!

**Напэўна, няма нічога больш вечнага, чым нашы ўспаміны. Ёсць такое, чаго не здолее сцерці ў памяці ніякі час. Любае, незабыўнае, басаножнае дзяцінства. Ураз успамінаецца да драбніц клас, школьныя двор з магутнымі бярозамі і кустамі бэзу, пладовы сад і агарод. Школьныя сябры, настаўнікі, праца ў калгасе ў час летніх канікулаў. Няма ўжо той старой вялікай драўлянай школы, таго школьнага двара ў вёсцы Мялешкі, што на Случчыне. На месцы былой школы цяпер красуюцца тры мураваныя дамы з гаспадарчымі пабудовамі, а новая школа цяпер у другім месцы — двухпавярховая, са светлымі прасторнымі класамі, стадыёнам. Шмат расце вакол кветак. Малады калектыў педагогаў...**

Школьныя настаўнікі, якія яны былі ў нашым жыцці? Сумленныя і справядлівыя, добрыя і працавітыя, строгія і вясёлыя. Тыя, каго мы так шчыра любілі і паважалі, чые ўрокі памятаем да гэтага часу. Напэўна, толькі з узростам пачынаеш разумець, якое вялікае шчасце — сустрэць у жыцці Настаўніка з вялікай літары, чалавека, да якога хацелася быць падобным. Такім быў наш першы настаўнік Канстанцін Рыгоравіч Перагуд. Сустрэў ён нас на парозе школы ў 1954 годзе і правучыў чатыры гады. З ім цікава было і на ўроках, і на прагулках, і на калгасным полі. Менавіта свайму першаму настаўніку мы, вучні, многім абавязаны. Потым чатыры гады нашым класным кіраўніком і адначасова настаўніцай рускай і нямецкай моў была Зінаіда Уладзіміраўна Булат. Нельга не прыгадаць добрым словам дырэктара школы Уладзіміра Фёдаравіча Праневіча, завуча Адама Сямёнавіча Шыловіча. Яны ваявалі, былі ў партызанах, мелі ордэны і медалі. Шмат сіл аддалі нам, сваім вучням, настаўніца беларускай мовы Вольга Адамаўна Свяцько, хіміі і біялогіі — Ніна Іванаўна Бранкевіч, алгебры і геаметрыі — Ніна Васільеўна Краўчэня, фізкультуры і працоўнага навучання — Міхаіл Антонавіч Сяўрук. Вялікі дзякуй усім педагогам, якія працавалі ў школе ў канцы 50-х—пачатку 60-х за іх цярплівасць і дабрыню, за ўсе цікавыя ўрокі ў школе і па-за школай.

Неяк мой дзядзька Адам Сямёнавіч сказаў, што мы застаёмся дзецьмі да тых часоў, пакуль жывыя нашы бацькі. Настаўнікі ж да тых часоў застаюцца настаўнікамі, пакуль у іх ёсць вучні, якія іх памятаюць. Для нас нашы настаўнікі былі бездакорнымі.

Сёлета нашаму першаму выпуску споўнілася паўстагоддзя. Мы «рассыпаліся» па ўсёй краіне. Але кім бы ні сталі, галоўнае, што ў кожным засталася часцінка душы тых, хто нас некалі вучыў.

Не забывайце сваіх настаўнікаў. Упэўнены, што ім заўсёды прыемна атрымліваць віншаванні ад сваіх вучняў. Гэта значыць, што ў жыцці і лёсе свайго вучня настаўнік адыграў не апошнюю ролю..

**Міхаіл МАСЮК,** *Слуцк*


ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ!

*Учреждение образования*
«Белорусская государственная сельскохозяйственная академия»

**ПРИНИМАЕТ СТУДЕНТОВ НА ОБУЧЕНИЕ БЕЗ ОТРЫВА ОТ ПРОИЗВОДСТВА**
ПО СЛЕДУЮЩИМ СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ:

**агрономия** (полный и сокращенный срок обучения); **экология сельского хозяйства; зоотехния** (полный и сокращенный срок обучения); **промышленное рыбоводство; техническое обеспечение процессов сельскохозяйственного производства** (полный и сокращенный срок обучения); **мелиорация и водное хозяйство; сельское строительство и обустройство территорий; землеустройство; бухгалтерский учет, анализ и аудит** (полный и сокращенный срок обучения); **финансы и кредит; экономика и организация производства в отраслях агропромышленного комплекса** (полный и сокращенный срок обучения); **коммерческая деятельность; правоведение; маркетинг.**

**ПИНСКИЙ ФИЛИАЛ: техническое обеспечение процессов сельскохозяйственного производства.**

**ПОЛЕССКИЙ ФИЛИАЛ: агрономия** (с сокращенным сроком обучения); **бухгалтерский учет, анализ и аудит** (с сокращенным сроком обучения).

*Прием документов –* **с 1 по 30 ноября 2012 года.**
*Вступительные испытания –* **с 1 по 20 декабря 2012 года.**
Полная информация на сайте академии: **http://www.baa.by/zaochnoe/abiturient/**
Телефон приемной комиссии: **8/02233/5-94-65.**
**Ждем вас и желаем успехов!**
УНП 700046636

Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна
ЗАПРАШАЕ АБІТУРЫЕНТАЎ-2013
ДЗЕНЬ АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ
**У праграме:**
✓ сустрэча з кіраўніцтвам універсітэта;
✓ кірмаш спецыяльнасцяў;
✓ вынікі ўступнай кампаніі 2012 года;
✓ перспектывы выпускнікоў;
✓ знаёмства з факультэтамі;
✓ прафарыентацыйнае тэсціраванне.
**Чакаем вас 3 лістапада 2012 года ў 11.00 па адрасе: Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21, аўдыторыя 317**
тэл. **23 04 17** E-mail: **brsu.brest.by**
УНП 200050321

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНОЛОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ
**проводит прием на 8-месячные подготовительные курсы**

Курсы предусматривают интенсивную эффективную подготовку к централизованному тестированию.

Продолжительность занятий 8 месяцев с октября 2012 г. по май 2013 г. Лекции и практические занятия проводятся 3 раза в неделю по 3 академических часа в день по каждому из необходимых предметов.

Занятия на курсах проводят высококвалифицированные штатные преподаватели кафедр университета. В ходе занятий учащиеся знакомятся с требованиями и программами вступительных испытаний. Занятия на курсах способствуют адаптации к условиям обучения в университете.

В настоящее время БГТУ – ведущий вуз в лесной, химической и полиграфической отраслях Республики Беларусь. В 2013 году БГТУ будет осуществлять набор абитуриентов из Беларуси, стран СНГ и дальнего зарубежья для поступления на специальности по самым престижным, высокодоходным и перспективным направлениям:

- **лесное хозяйство, геоинформационные системы, садово-парковое строительство, ландшафтный дизайн, туризм и природопользование;**
- **машины и оборудование лесного комплекса, лесоинженерное дело, технология деревообработки, клееных материалов и плит, технология и дизайн мебели, энергоэффективные технологии и энергетический менеджмент;**
- **технология нефтехимического синтеза и химическая технология производства и переработки полимерных материалов и эластомеров, биотехнология и биоэкология, технология лакокрасочных материалов, лесохимических и целлюлозно-бумажных производств, технология лекарственных препаратов, эфирных масел и парфюмерно-косметических продуктов, стандартизация и сертификация промышленных и пищевых продуктов и лекарственных препаратов;**
- **химическая технология минеральных удобрений, тонкого неорганического синтеза, стекла и керамики, вяжущих и строительных материалов, композиционных материалов, машины и аппараты химических производств, автоматизированные системы управления, охрана окружающей среды и промышленная экология;**
- **издательское дело и полиграфия, полиграфическое оборудование и системы обработки информации, информационные системы и технологии;**
- **экономика, маркетинг, менеджмент, бухучет, анализ, аудит и др.**

**Приглашаем в наш университет!**
**220050, Минск, Свердлова, 13а. Тел. 327 73 89**
**www. bstu.unibel.by**
УНП 100354659

ВЫ МОЖЕТЕ ЕЩЁ ПОСТУПИТЬ В ВУЗ
ОБРАЗОВАНИЕ УНН 191170822
❑ ВЫСШЕЕ; ❑ ВТОРОЕ ВЫСШЕЕ
**Продолжается приём на заочную форму обучения:**
◆ ЮРИСПРУДЕНЦИЯ (специализации: гражданско-правовая, уголовно-правовая);
◆ ФИНАНСЫ И КРЕДИТ;
◆ БУХГАЛТЕРСКИЙ УЧЁТ, АНАЛИЗ И АУДИТ;
◆ ЭКОНОМИКА ОРГАНИЗАЦИИ (предприятия);
◆ МЕНЕДЖМЕНТ ОРГАНИЗАЦИИ;
◆ АНТИКРИЗИСНОЕ УПРАВЛЕНИЕ; ◆ ЛОГИСТИКА.
❑ Классическое заочное и **дистанционное** обучение; ❑ Сроки обучения:
➤ **3 года** на базе среднего специального профильного (техникум, колледж) и высшего образования (вступительные испытания – внутреннее собеседование в ВУЗе);
➤ **5 лет** на базе среднего образования (вступительные испытания – внутреннее тестирование в ВУЗе);
❑ Обеспечение студентов-заочников общежитием; ❑ Доступная стоимость обучения;
❑ Выпускники ВУЗов получают **ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ДИПЛОМЫ**;
❑ Приём документов и обучение по потокам: 3-ий до 20 октября; 4-ый до 20 ноября.



О порядке поступления и обучения – официально в «ВПО ПРОФКОНСУЛЬТАНТ»,
**220004, г. Минск, ул. Коллекторная, д. 20 «А»,**
**тел.: (017) 200-82-57, 200-63-51**
**GSM (029) 509-82-57, (044) 709-82-57**
**www.vpo.by**
Свидетельство о государственной регистрации № 191170822 от 26.05.2009 г. Мингорисполкома.

Падрыхтоўчае аддзяленне ўстановы адукацыі «БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ АКАДЭМІЯ МАСТАЦТВАЎ»
**ПРАВОДЗІЦЬ НАБОР НА ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ**
**па спецыяльных дысцыплінах:**
❑ ФАКУЛЬТЭТ ДЫЗАЙНУ І ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА:
**малюнак, жывапіс, кампазіцыя (па накірунках)**
❑ ТЭАТРАЛЬНЫ ФАКУЛЬТЭТ:
**майстэрства акцёра, сцэнічная мова, вакал, рэжысура тэатра**
❑ ФАКУЛЬТЭТ ЭКРАННЫХ МАСТАЦТВАЎ:
**Рэжысура тэлебачання, тэлеаператарства, гукарэжысура.**
УНП 100289132.

Падрыхтоўка слухачоў ажыццяўляецца на платнай аснове. Тэрмін навучання на падрыхтоўчых курсах з 1 кастрычніка па 30 чэрвеня. Навучальныя праграмы — 3, 6, 8, 9 месяцаў. Форма навучання — дзённая, вячэрняя.

**Даведкі па тэлефоне: (017) 265 06 03.**



Прадпрымальны фермер са сваім сынам Віктарам.

# Яблычна-вішнёвы курорт Чабатароў...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Першы ж сад Віктар Іосіфавіч пасадзіў, калі працаваў кіраўніком калгаса.

— У калгасе нічога не было, акрамя быкоў і кароў. А хацелася штосьці такое прывабнае для людзей. Вось і пасадзілі 50 гектараў саду за 2 месяцы. Тады я ў гэтым мала што разумеў... Гэта цяпер удзельнічаю ў розных навуковых канферэнцыях. Ведаеце, чаго я ад сябе не чакаў? Таго, што ў 50 гадоў з адукацыяй інжынера буду штосьці казаць пра садоўніцтва (*смяецца*).

## «ПА САДОЎНІЦТВЕ НЕ ПРАЧЫТАЎ НІВОДНАЙ КНІЖКІ»

Ішоў час. Ініцыятыўнага кіраўніка калгаса ўсё часцей пачала наведваць думка абзавесціся ўласным садам.

— 15 гадоў таму ў нас з Надзяй было толькі 18 гектараў сельгасугоддзяў, — узгадвае фермер. — На іх мы і пасадзілі яблыні. Тады я і падумаць не мог, што ў мяне некалі будуць такія аб'ёмы — 20 тон у дзень яблыкаў збіраем. Сёння ж у Мядзельскім і прылеглых раёнах больших садоў, чым мой, няма.

І гаворка тут ідзе не толькі пра 40 гектараў яблыневых садоў, але і пра адзін з самых вялікіх у рэспубліцы вішнёвых сад — каля 30 гектараў. Сёння сярэдняя ўраджайнасць 1 гектара вішні Чабатароў складае 10-12 тон.

**— Віктар Іосіфавіч, многія фермеры скардзяцца на праблемы з рэалізацыяй. Маўляў, часам выгадней пакінуць іх гніць на дрэве, чым наймаць людзей для іх збору...**

— Мы пайшлі па іншым шляху. Разумеем, што немагчыма ўсё сабраць самім. Акрамя ж яблыкаў і вішань, вырошчваем яшчэ і суніцы, маліны... Аб'ёмы сур'ёзныя. Таму любы ахвотны можа запісацца і прыехаць да нас, каб сабраць для сябе патрэбную колькасць ягад. Ахвотнікаў хапае, бо ягады тут абыходзяцца значна танней, чым на рынку. У асобныя дні на плантацыі прыязджае да некалькіх сотняў чалавек.

**«Акрамя яблыкаў і вішань, вырошчваем яшчэ і суніцы, маліны... Аб'ёмы сур'ёзныя. Таму любы ахвотны можа запісацца і прыехаць да нас, каб сабраць для сябе патрэбную колькасць ягад».**

У наступным годзе фермер плануе купіць польскі камбайн для збору вішні і прадаваць яе ў замарожаным выглядзе. Бо плошчы пад гэтай ягадай неўзабаве павялічацца амаль да 100 гектараў.

— У садзе заўсёды больш расчараванняў, чым радасці, — прызнаецца гаспадар яблыневага раю. — І да гэтага трэба быць маральна гатовым. Люблю, калі сад квітнее, калі ён пад яблыкамі. Але вельмі сумна, калі недзе недапрацаваў са сродкамі абароны. З 1997 па 2000 год было ўсякае, бо не хапала ведаў (жонка ў мяне былы гандлёвы работнік, я інжынер). Тое, што садзілі, гінула вельмі хутка. І толькі пасля таго, як звярнуўся да навукі, штосьці стала атрымлівацца. Цесна супрацоўнічаю з прафесарамі і дактарамі навук Інстытута пладаводства, з Інстытутам ахоўы раслін нашай Акадэміі навук. Маю шмат сяброў і ў Польшчы. Беларуская навукоўцы і польскія фермеры — мае асноўныя кансультанты. Ніводнай кніжкі не прачытаў па садоўніцтве, паверце. Вось разважаем, як з вамі. Як кажуць, не май 100 рублёў, а май 100 сяброў.

Хоць і без грошай, безумоўна, у такой справе ну ніяк.

— У межах праграмы развіцця пладаводства на 2004-2010 гады мы атрымалі значную фінансавую дапамогу ад дзяржавы — субсідыі, ільготныя крэдыты, выгадныя пазыкі, — распавядае Віктар Іосіфавіч. — Дзяржава нам дапамагае вельмі шмат і цяпер. Толькі дзякуючы дзяржаўным інвестыцыям у снежні 2011 года пабудавалі новае сучаснае сховішча ёмістасцю 1000 тон. Гэта вялікае падспор'е для гаспадаркі. Цяпер мы можам пашыраць плошчы пад пладовымі дрэвамі і забяспечыць па гэтых відах прадукцыі стапрацэнтнае імпартазамяшчэнне на тэрыторыі раёна. Думаю, мы апраўдалі аказаны давер на ўсе сто, беларускай сельскай гаспадарцы за нас не сорамна.

На новым сучасным складзе Чабатары плануюць захоўваць не толькі свае яблыкі, але і імпартную садавіну: вінаград, апельсіны, мандарыны. З гэтай мэтай вядуць перагаворы з малдаванамі, палякамі, грэкамі.

— Будуць зімаваць на складзе таксама морква, буракі і яблыкі для дамоў адпачынкаў, школ, — дадае Віктар Іосіфавіч. — Бо школьныя падвалы не прыстасаваны для працяглага захоўвання гародніны. Мы ж цяпер у вялікіх аб'ёмах можам захоўваць яе якаснай да новага ўраджаю.

## «А ЧАЦВЁРТЫ ЧАЛАВЕК НА ГЭТЫ ЯБЛЫК НАВАТ НЕ ПАГЛЯДЗІЦЬ»

Тэлефон Віктара Іосіфавіча разрываўся ад званкоў, таму ён перадаручыў мяне аднаму са сваіх лепшых работнікаў, Аляксею Мажэйку. Хлопец трэці год працуе ў гаспадарцы «Антэй-сад» інжынерам-энергетыкам.

— Я жыву з Віктарам Іосіфавічам па суседстве, з яго сынам Віцем змалку сябрую, з трэцяга курса тут на практыцы, таму і папрасіў, каб мяне пасля ўніверсітэта размеркавалі сюды, — распавядае малады чалавек. — Давайце я вам пакажу новы цэх, дзе вырабляюцца натуральныя сокі з яблыкаў і сухафрукты. Я за яго адказваю з самага пачатку, нават пашчасціла разам з польскімі мантажнікамі абсталёўваць яго. Пастэрызацыя нашых сокаў адбываецца пры 70 градусах — гэта дазваляе захаваць максімум карысных рэчываў.

Як высветлілася, «Антэй-сад» вельмі мала працуе з гандлем. Наліўныя, румяныя яблыкі, сокі, сухафрукты пастаўляюцца ў асноўным у санаторыі, школы, дзіцячыя садкі Мядзельшчыны, па суботах прадаюцца на рынку ў раённым цэнтры.

— Рэалізоўваем прадукцыю і на экспарт. На аднаго рабочага мы сёлета, напэўна, тысяч па 12 еўра прывязём, — распавядае фермер. — З «Еўраопта» нядаўна на мяне выйшлі, хочуць супрацоўнічаць. Але працаваць з гандлёвымі сеткамі вельмі цяжка. Цяжка перш за ўсё да іх патрабаванняў падысці. Дастаўка тавару ў прызначаны час, аплата, як я яе называю, — калі-небудзь. Тое, што не рэалізавана, абавязаны забраць сабе назад. І калі вы звярталі ўвагу, у скрыні ляжаць яблыкі. Чалавек праходзіць і не праміне, каб не націснуць пальцам на гэты яблык. Я націснуў, вы, Сцяпанавіч — чацвёрты чалавек на гэты яблык нават не пагалядзіць. Сама схема рэалізацыі нашага прадукту не павінна быць такой. Таму жадання працаваць з гандлёвымі сеткамі пакуль няма ніякага. Толькі калі яны пераканаюць мяне ў тым, што гэтая праца будзе плённай, будзем працаваць. Што тычыцца прасоўвання прадукцыі, то ў гэтым плане ў мяне вялікія спадзяванні на дачку, якая сёлета скончыла ўніверсітэт па спецыяльнасці «Эканаміст-менеджар».



Суседскага хлопца Віктар Чабатар таксама заахвоціў вярнуцца працаваць на малую радзіму.

**«Ведаеце, чаго я ад сябе не чакаў? Таго, што ў 50 гадоў з адукацыяй інжынера буду штосьці казаць пра садоўніцтва».**

## «Я СВАЙГО ЖЫЦЦЯ БЕЗ ГЭТЫХ МЕСЦАЎ НЕ ЎЯЎЛЯЮ»

Сёння ў «Антэй-садзе» працуюць 15 штатных супрацоўнікаў. З іх з вышэйшай адукацыяй 6 — у тым ліку Віктар Чабатар з жонкай і іх дзеці.

— Мы змалку дапамагалі бацькам, — узгадвае Віктар Чабатар-малодшы, які два гады таму скончыў біялагічны факультэт БДУ. — Мне было 9 гадоў, калі пасадзілі першы сад. На пытанне сяброў «Дзе правёў лета?» адказваў: «На курорце». Бо тут у нас самы лепшы загар (*смяецца*). Студэнты пра гэта ведаюць, таму многія з іх прыязджаюць да нас на падпрацоўку. Сёлета за 10 дзён па 2 млн зарабілі.

— Сёння людзі атрымліваюць у мяне не самую нізкую зарплату, — працягнуў грашовую тэму Віктар Іосіфавіч. — Сярэдняя зарплата па гаспадарцы каля 3 млн. За ліпень жа людзі атрымалі па 6-7 млн. Але ўсё ж тыповая для вёскі праблема з кадрамі ёсць: знайсці чалавека, які адказна ставіцца да працы, цяжка. Здавалася б, на моладзь усе спадзяванні. Але баюся, што ніякім заробкам не ўтрымаеш маладых людзей у паміраючай вёсцы. Гэта мы з жонкай свайго жыцця без гэтых месцаў не ўяўляем, бо тут усё наша, роднае, неад'емнае. Прыкладу ўсе намаганні, каб сваіх дзяцей пакінуць на вёсцы. А вось што тычыцца астатніх, то, баюся, з'едуць яны туды, дзе ёсць інфраструктура: клубы, тэатры, добрыя крамы... Балюча бачыць, як пусцеюць вёскі, як не знаходзіцца гаспадара...

**Надзея ДРЫЛА, Фота аўтара.**
*Мядзельскі раён*

■ Факт

## У школы вяртаецца трэцяя гадзіна фізкультуры

**Міністэрства адукацыі прапанавала ўвесці ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з кастрычніка абавязковыя для кожнага навучэнца факультатыўныя заняткі «Гадзіна здароўя і спорту». Такім чынам у галоўным адукацыйным ведамстве збіраюцца кампенсаваць дэфіцыт рухальнай актыўнасці, характэрны для абсалютнай большасці школьнікаў.**

Вучэбная гадзіна, якая будзе выдзяляцца для правядзення гэтых заняткаў, па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя не будзе ўлічвацца пры вызначэнні максімальна дапушчальнай вучэбнай нагрузкі за тыдзень на аднаго навучэнца. Дадатковая гадзіна фізкультуры з'явіцца ў школе дзякуючы вучэбным гадзінам, якія адводзяцца ў тыпавым вучэбным плане на правядзенне факультатыўных, стымулюючых і падтрымліваючых заняткаў. У Міністэрстве адукацыі тлумачаць, што правядзенне факультатыву па фізкультуры можа быць арганізавана як у першай, так і ў другой палове дня, або ў шосты школьны дзень. Дапускаецца таксама ўключэнне факультатыву па здароўі і спорту ў расклад вучэбных заняткаў. «Для наведвання дзіцём гэтага факультатыву заява ад законных прадстаўнікоў навучэнца не патрабуецца», — падкрэсліваюць у міністэрстве. «Спартыўны» факультатыў будзе, як правіла, праводзіцца на свежым паветры, прычым у гульнявой форме. У I—IV класах акцэнт будзе зроблены пераважна на рухавыя гульні, рытміку, танец і аэробіку. У V— XI класах — на гульнявыя віды спорту (футбол, баскетбол, гандбол, хакей), плаванне, аэробіку і танец. Пры фарміраванні груп будуць улічвацца ўзроставыя асаблівасці, інтарэсы навучэнцаў, а таксама стан іх здароўя. Актыўнасць навучэнцаў на такіх занятках не будзе ацэньвацца педагогам адзнакамі ў балах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Спрасціць працэдуру

**арганізацыі пунктаў аўтасэрвісу ў гаражных кааператывах прапаноўваюць у Мінгарвыканкаме.**

Спецыялісты гарадскога выканаўчага камітэта прапаноўваюць спрасціць працэдуру арганізацыі пунктаў тэхабслугоўвання аўтамабіляў у боксах гаражных кааператываў. Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення бытавога і гасцінічнага абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама Андрэй Новікаў. Адпаведная прапанова накіравана на разгляд у вышэйстаячыя органы. Варта адзначыць, што ў сталіцы зарэгістраваны 709 аб'ектаў па абслугоўванні і рамонце аўтамабіляў, у той час як ва ўласнасці мінчан больш за 700 тыс. легкавых аўтамабіляў.

**Марына КАСЦЮКЕВІЧ, «Мінск-Навіны».**

BelSwissBank
БЕЛОРУССКО-ШВЕЙЦАРСКИЙ БАНК

Наименование банка:

**Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк БелСвиссБанк»**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 октября 2012 года**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | на 01.10.2012 г. | на 01.10.2011 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 141 247,2 | 51 204,1 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 53 717,0 | 65 475,4 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 210 209,0 | 90 072,3 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 277 974,2 | 229 558,1 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 158 811,3 | 6 894,1 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 72 377,8 | 27 583,5 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 0,0 | 0,0 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 15,0 | 15,0 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 150 428,2 | 67 159,1 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 0,0 | 0,0 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | | 20 947,6 | 12 771,9 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | | 1 085 727,3 | 550 733,5 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | | 31 238,6 | 30 631,5 |
| 16 | Средства банков | 1202 | | 79 840,2 | 85 186,8 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | | 716 280,8 | 328 390,1 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 0,0 | 38,4 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 0,0 | 0,0 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | | 4 099,2 | 1 610,5 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 831 458,8 | 445 857,3 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | | 131 826,3 | 58 396,3 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,0 | 0,0 |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 6 595,0 | 3 516,9 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 96 349,2 | 28 471,9 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | | 19 498,0 | 14 491,1 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | | 254 268,5 | 104 876,2 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 1 085 727,3 | 550 733,5 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 01 октября 2012 года**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 01.10.2012 г. | 01.10.2011 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 37 471,9 | 10 153,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 15 921,7 | 5 056,3 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 21 550,2 | 5 097,0 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 55 479,4 | 27 734,3 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 8 145,0 | 7 565,0 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 47 334,4 | 20 169,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 4 386,3 | 22 554,0 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (3 007) | (301,2) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 46 855,5 | 22 349,1 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (27,1) | (3 936,8) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 38 076,9 | 24 232,5 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 7 418,7 | 5 673,4 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 62 120,9 | 28 830,9 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 4 081,3 | 1 542,2 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 20 231,9 | 16 999,2 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 4 666,3 | 1 721,0 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 15 565,6 | 15 278,2 |

**Руководитель** **В.А. Казбанов**
**Главный бухгалтер** **И.И. Трепашко**

Лицензия Национального банка РБ на совершение банковских операций № 7 от 29.12.2008 г.

■ Соцыум

# ЦІМ І КІМ

**Гісторыя гэтых братоў сведчыць пра вельмі важны зрух у жыцці нашага грамадства. Да з'яўлення ў 1999 годзе інстытута прыёмнай сям'і такія дзеці практычна не мелі шанцаў набыць другую сям'ю ў Беларусі. Ды і прыёмныя бацькі да апошняга часу імкнуліся ўзяць да сябе здаровых і беспраблемных дзяцей. І толькі на працягу некалькіх апошніх гадоў і ў спецыялістаў, і ў патэнцыйных бацькоў з'явілася разуменне, што дзецям з асаблівасцямі развіцця сям'я патрэбна больш, чым каму-небудзь іншаму. Цёплая дамашняя атмасфера здольная не проста палепшыць іх жыццё, але часам і цалкам пазбавіць «асаблівых» дыягназаў.**

Іх так і называюць у сям'і: «Цім і Кім», нібы яны — непадзельнае цэлае, адзін без аднаго не тое што не могуць існаваць, але будуць ужо не тымі, хто яны ёсць. Аднак гэтак было не заўсёды. Ды і не ўсе разумелі, наколькі бясцэнная еднасць — Цім-і-Кім.

Цімафей нарадзіўся першым. Ён жыў з бабуляй і маці і хадзіў у садок... Увага да гэтай сям'і з боку педагогаў і грамадскасці была з самага пачатку, бо маці хлопчыка ў свой час скончыла дапаможную школу-інтэрнат.

Цім быў падобны на медзведзяня, — згадвае Наталля Сівуха, дзіця якой хадзіла ў садку ў адну групу з Цімафеем. — У сваім развіцці амаль не адставаў ад дзяцей лагапедычнай групы, якую наведваў, праўда быў на год старэйшы за астатніх. Ён выконваў усе навыкі, а маці, як магла, яго даглядала.

«Як магла» — тут ключавое слова, яго паўтаралі і іншыя людзі, якія ведалі хлопчыкаў да 2010 года: «любіла, як магла», «клапацілася, як магла»...

А вось аповеды пра бабулю адрозніваюцца: адны кажуць, што бабуля злоўжывала алкаголем, іншыя катэгарычна не пагаджаюцца з гэтым і сцвярджаюць, што часам нецвярозай можна было ўбачыць якраз маці, а на бабулі ўся сям'я трымалася. Але несумненна адно: адпаведныя службы і грамадскія арганізацыі змагаліся за гэтую сям'ю. Аднак захаваць яе не ўдалося.

— Цімафей у садку не выказваў творчых здольнасцяў, — спрабуе намацаць першыя прыкметы катастрофы Наталля Сівуха. — У нашых дзяцей была вельмі добры музычны педагог. Дзякуючы яе заняткам у майго дзіцяці дыягназ на момант паступлення ў школу быў цалкам зняты, і я аддала яго ў клас з музычным ухілам, а вось Цімафей пайшоў у 67-ю, звычайную, школу...

У дашкольным узросце яму не хапала не столькі догляду, колькі выхавання, лічыць жанчына. Напрыклад, ён добра лічыў, але не чытаў. На выпускным ранішніку ў садку з цяжкасцю расказаў вершык з чатырох радкоў. Адным словам, не артыст... Наталля запомніла, што маці Цімафея была адзінай, хто фінансава не ўдзельнічаў у арганізацыі выпускнога, тым не менш на свята да сына яна прыйшла з кветкамі.

Напэўна, яе імкненне быць добрай маці, наколькі яна магла, у многіх выклікала жаданне дапамагчы. Падобна таму, як мы імкнёмся падхапіць чалавека, які на нашых вачах губляе раўнавагу, але з усіх сіл стараецца ўтрымацца на нагах.

— Яна рэдка прыходзіла на бацькоўскія сходы, але заўсёды з гатоўнасцю мыла вокны ў дзетсадаўскай групе, — расказвае Наталля Сівуха. — Цімафея прыводзіла і забірала, апрануты ён быў....ну не ў напрасаванае, але, ва ўсякім выпадку, па сезоне. Часам выхавацелька ёй у гэтым дапамагала.

Маці Цімафея тады працавала прыбіральшчыцай у медыцынскім універсітэце і гандлявала гароднінай і зелянінай каля магазіна, і хлопчык хутка навучыўся лічыць грошы, у чым апераджаў аднагодкаў. У сем гадоў ён ужо самастойна хадзіў у магазін і не меў відавочных прыкмет інтэлектуальнага адставання. Прыкладна ў гэты час і з'явіўся на свет малодшы яго брат — Кім.

Наталля Сівуха зноў сутыкнулася з сям'ёй Цімафея праз два гады. Ужо ў іншай дашкольнай установе яе дзеці і маленькі Кім аказаліся разам. Напэўна, за гэты час сітуацыя ў сям'і хлопчыкаў пагоршылася. Больш выразна, магчыма, у сувязі са з'яўленнем другога дзіцяці, на іх жыцці сталі адбівацца матэрыяльныя цяжкасці. У выніку старэйшы брат не засвоіў праграму 1 класа і аказаўся ў дапаможнай школе-інтэрнаце № 11, той самай, якую калісьці скончыла яго маці, а кіраўніцтва сталічнага садка № 336, які наведваў Кім, праінфармавала органы апекі, што дзіця знаходзіцца ў небяспечным стане.

Пачалася барацьба за сям'ю. Выхавацелі і сацыяльныя педагогі дапаможнай школы-інтэрната прывезлі ў кватэру хлопчыкаў спісаную мэблю, шпалеры... Валанцёры з Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам (БелАДДІіМД) прынеслі ў сям'ю гуманітарную дапамогу, паспрабавалі ўключыць маці хлопчыкаў у прыхадское жыццё мясцовай праваслаўнай абшчыны імя прападобнага Серафіма Сароўскага. Сацыяльны педагог бліжэйшай ад іх дома навучальнай установы — гімназіі № 12 — вымыла пліту і халадзільнік, цясляр з гэтай гімназіі адрамантаваў дзверы... Паклеілі шпалеры, уцяплілі вокны. Хадайнічалі перад ЖРЭА, каб у кватэры не адключалі гарачую ваду і электрычнасць за даўгі. Супрацоўнікі 336-га садка прынеслі бялізну і мыйныя сродкі... Але ўсяго гэтага аказалася недастаткова.

— Сітуацыя там была складаная, — расказвае супрацоўніца БелАДДІіМД Ірына Логвін. — Сем'ям, якія знаходзяцца ў крызісным становішчы, у тым ліку і тым, дзе бацькі маюць інтэлектуальныя або фізічныя абмежаванні, неабходна падтрымка спецыялістаў і арганізацыя пастаяннага суправаджэння. Трэба спачатку вывучыць, у чым сям'я мае патрэбу, а потым ёй дапамагаць. Каб захаваць сям'ю Кіма і Ціма, трэба было навучыць маці клопату аб дзецях, іх выхаванні. Тут патрэбна была не аднаразовая дапамога, мала было абавязаць маці выканаць нейкія ўмовы, — патрэбна была іншая арганізацыя работы з гэтай сям'ёй. Напрыклад, у дзень заробку дапамагаць плаціць за камунальныя паслугі...

Дырэктар дапаможнай школы-інтэрната № 11 Уладзімір Русецкі не згодны: «Як вы гэта сабе ўяўляеце? А калі маці скажа: «Як хачу — так і выдаткоўваю свае грошы!» Гэта тычыцца і ўсяго астатняга. Мы прыходзім да дзяцей, а там сядзяць пяць здаровых мужыкоў і выпіваюць, і мы нічога з гэтым не можам зрабіць. Добра яшчэ, калі з намі ходзіць участковы...»

Усё стала яшчэ горш, калі бабуля хлопчыкаў памерла. Пасля таго, як чарговая камісія аддзела адукацыі выявіла адсутнасць умоў для нармальнага развіцця дзяцей, Ціма і Кіма ад маці забралі. Ірына Логвін, якая прысутнічала пры гэтым, узгадвае, што дзеці плакалі. Цім не вытрымаў і збег...

— Ён, магчыма, не столькі з-за расстання з маці перажываў, колькі з-за магчымага расстання з братам, — мяркуе намеснік дырэктара дапаможнай школы-інтэрната № 11 Любоў Кахановіч. — Ён вельмі прывязаны да Кіма, вельмі любіць яго.

Пагроза таго, што браты могуць быць разлучаны, была рэальная. Цім, як вучань дапаможнай школы-інтэрната, мае статус дзіцяці з асаблівасцямі развіцця. Кім на момант адабрання ад маці такі статус яшчэ не набыў, хоць у яго медыцынскай картцы нехта з урачоў зрабіў запіс у парушэнне ўсіх інструкцый: «Разумовае адставанне пад пытаннем». Спецыялісты кажуць, што абодва хлопчыкі спачатку мелі выразную педагагічную запушчанасць, якая без своечасовай карэкціроўкі можа прывесці да інтэлектуальных абмежаванняў, што адбылося з Цімам і пагражала Кіму.

Маленькага Кіма пагаджалася забраць адна з прыёмных сямей раёна, Цім жа павінен быў адправіцца ў спецыялізаваную агульнаадукацыйную школу-інтэрнат № 7 для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Гэта азначала, што калі за малодшага брата нехта гатовы быў пазмагацца, то лёс старэйшага ў разлік маглі і не ўзяць... Але, на шчасце, у раёне якраз адкрыўся дзіцячы дом сямейнага тыпу, у якім не пабаяліся «асаблівага» дыягназу Ціма. Перажыўшы смерць бабулі і расстанне з маці, хлопчыкі пазбеглі яшчэ адной трагедыі — раз'яднання.

— Я ведала гэтую сям'ю яшчэ да адабрання дзяцей, калі разам з іншымі валанцёрамі спрабавала дапамагчы выправіць сітуацыю, — расказвае маці-выхавацель дзіцячага дома сямейнага тыпу Наталля Янушкевіч. — Але дзеці патрапілі ў прытулак. Восенню 2010 года я забрала іх да сябе. Кім пайшоў у лагапедычную групу дзіцячага садка. Абодва хлопчыкі прайшлі скрупулёзнае медыцынскае абследаванне. Высветлілася мноства не цяжкіх, але запушчаных хвароб — галоўным чынам, наступствы антысанітарыі і звязаныя з гэтым ускладненні. Калі хлопчыкі пазбавіліся ад інфекцый і паразітаў, сталі добра харчавацца і трохі адышлі ад перажытага стрэсу, яны і развівацца сталі нармальнымі тэмпамі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Праз некаторы час у Кіма знялі ўсе дыягназы. Сёння ён вучань 1 класа агульнаадукацыйнай школы. На жаль, перавесці Ціма з дапаможнай школы ў звычайную аказалася больш складана: надта вялікі разрыў у навучальных праграмах, ды і для кампенсацыі педагагічнай запушчанасці ў падлеткавым узросце патрэбна значна больш часу. «Калі б была магчымасць наняць для яго рэпетытараў, можа, гэта і ўдалося б», — разважае маці-выхавацель. Аднак такая дапамога дзіцячым дамам сямейнага тыпу не прадугледжана. Тым не менш, Наталля не пакідае надзеі пазбавіць Ціма «асаблівага» дыягназу.

Цім — адзін з лепшых вучняў у сваёй школе. Педагогі заўважаюць, што сёння яго асоба фарміруецца ў спрыяльных умовах. Ён стаў больш упэўнены ў сабе, больш спакойны і разважлівы. Між іншым, аказалася, што ён добра спявае. Намаганні музычнага работніка ў садку не прапалі дарэмна. Усё ж такі — артыст...

Я бачыла гэтых хлопчыкаў у новай іх сям'і зусім нядоўга — хвілін 10. Але яны пакінулі самае лепшае ўражанне. Асабліва спадабаўся Цім. Чарнявы, высокі, сімпатычны. Ён, магчыма, трохі хваляваўся, часта мяняў позу, міжволі жэстыкуляваў. Але на ўсе пытанні адказваў добразычліва і прадумана, клапатліва паглядаў на малодшага брата, увесь прамяніўся дабрынёй і адначасова — сур'ёзнасцю. Адным словам — старэйшы брат.

Кім жа трымаўся больш напружана, ціснуўся да Наталлі: напэўна памяць пра чужых дарослых, ад якіх можа зыходзіць небяспека, яшчэ жывая ў ім.

— Яны ўжо супакоіліся, перасталі баяцца, але па маці сумуюць. Што з ёй, я не ведаю. І не ведаю, што ім казаць, — шэпча мне ў калідоры Наталля.

На наступны дзень я разам з прадстаўніком Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам Ірынай Логвін прыехала па старым адрасе хлопчыкаў. Дзверы ніхто не адчыніў. У тамбуры перад дзвярыма адчуваўся непрыемны пах. Акенца ў шчытку электралічыльніка было «нежывым». Але нам пашанцавала: на вуліцы мы сустрэлі маці хлопчыкаў. Яна выглядала лепш, чым я ўяўляла, і не толькі я, але і Ірына, якая бачыла яе 2 гады таму. Маці Ціма за гэты час вельмі прыкметна пахудзела. Яна расказала, што працуе, але пазыку за камунальныя паслугі дагэтуль не пагасіла... Калі мы спыталі, чаму яна не шукае сустрэч з дзецьмі, жанчына раптоўна расплакалася і сказала толькі: «Каб вы ведалі, колькі я выплакала слёз...»

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**P.S.** *Сёлета ва ўпраўленні адукацыі Маскоўскага раёна горада Мінска пры падтрымцы Прадстаўніцтва Міжнароднага дзіцячага фонду ў Рэспубліцы Беларусь рэалізуецца праект «Незвычайныя дзеці ў замяшчальнай сям'і», у выніку якога дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця або інваліднасцю, якія засталіся без апекі бацькоў, будуць пераважна ўладкоўвацца на сямейныя формы выхавання.*

■ У суседзяў

# ЧАМУ БУСЛЫ Ў ЛІТВЕ ЛАЙДАЧАЦЬ?

**Пытанне ўзнікла не адразу. Збіраўся пісаць пра жанчыну-скульптара, ведаў, што адна яе майстэрня знаходзіцца ў Паланзе, каля радзільні. Калі быў у Паланзе, ніяк не мог знайсці гэты дом. Мінакі таксама не маглі мне дапамагчы. Тады асмеліўся спыніць адну цяжарную жанчыну.**

«Вой, вы шукаеце леташні снег, — усміхнулася яна. — У Паланзе даўно зачынілі радзільню. Я паеду нараджаць у Клайпеду. Туды цяпер едуць жанчыны і з суседніх раёнаў».

Аказваецца, падобная сітуацыя склалася ва ўсёй Літве. У Вільнюсе вялікае радзільнае аддзяленне ў бальніцы Св. Якава (раней — Першая савецкая бальніца), якое было адкрыта яшчэ да вайны і дзе на свет з'явіўся не толькі я, але і мая будучая жонка, і наш сын, цяпер стаіць з безжыццёвымі вокнамі. Не тоўпяцца маладыя таты і ля вокнаў радзільнага аддзялення Вільнюскай бальніцы Чырвонага крыжа, у якой убачылі свет двое маіх унукаў. У вялікім сталічным горадзе засталіся толькі тры радзільныя дамы.

Прычына закрыцця радзільняў — рэзкае скарачэнне нараджальнасці. Раней яны былі ва ўсіх райцэнтрах, цяпер — толькі ў вялікіх гарадах. Для жанчын гэта нязручна, даводзіцца доўга дабірацца. А ў такіх сітуацыях нярэдка і хвіліны маюць вырашальнае значэнне. Ды і маладому бацьку цяпер ужо няпроста кожны дзень прыходзіць з букетам кветак да вокнаў радзільні, якая за паўсотні кіламетраў.

Але гэта пад увагу не бярэцца. Перамагае эканамічны фактар. Трымаць паўпустыя радзільні фінансава нявыгадна. Але і тут згубны ланцужок не рвецца: няма радзільняў — няма працоўных месцаў для медыцынскага персаналу, павялічваецца колькасць беспрацоўных.

Зрэшты, незапатрабаванымі ў Літве аказваюцца не толькі медыкі, але і педагогі. Сёлета 1 верасня ў школы краіны прыйшло на 20 тысяч школьнікаў менш, чым год таму. Дзевяць школ перасталі існаваць. Больш за тысячу настаўнікаў папоўнілі рады беспрацоўных. Гэты працэс міністр асветы і навукі Гінтарас Сцепанавічус называе «аптымізацыяй» (ад слова «аптымальны»). Яе старанна праводзіць ужо чацвёрты год, паспеўшы зачыніць 163 школы. Больш наўрад ці зачыніць: хутка выбары ў Сейм, будзе абраны і новы ўрад.

Наступствы змяншэння школьнікаў адчулі і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Сёлета дагаворы з імі падпісалі 29,9 тысячы першакурснікаў, а летась ва ўніверсітэты і каледжы паступіла 31,3 тысячы маладых людзей.

Вялікія дэмаграфічныя праблемы выявіліся ў 2011 годзе пасля перапісу насельніцтва Літвы. Гэта быў другі перапіс пасля набыцця незалежнасці і першы — з моманту ўступлення Літвы ў Еўрапейскі Саюз у 2004 годзе. Засмучальная карціна вымалёўвалася адразу ж пасля публікацыі папярэдніх вынікаў. За міжперапісны перыяд насельніцтва краіны скарацілася з 3,48 млн у 2001 годзе да 3,058 млн у 2011-м, гэта значыць, стала нават менш, чым было ў 1941-м. За дзесяць гадоў колькасць жыхароў краіны скарацілася на 440 600, або на 12,6% (для даведкі: насельніцтва Літвы дасягнула свайго гістарычнага піка ў 1989 г., калі склала 3,68 млн чал.).

А нядаўна генеральны дырэктар Дэпартамента статыстыкі Вілія Паленене паведаміла, што ў Літве ўжо няма і 3 млн жыхароў. На 1 верасня гэтага года зафіксавана толькі 2 988 000 жыхароў.

Як сцвярджае спадарыня Паленене, на скарачэнне колькасці жыхароў больш за ўсё паўплывала міграцыя (76,9%): за дзесяць гадоў з краіны з'ехалі 402 900 жыхароў, а прыехалі 64 200. З-за адмоўных натуральных страт, колькасць літоўцаў за дзесяць гадоў скарацілася на 101 900 (23,1%).

Негатыўная тэндэнцыя працягваецца. За першыя 8 месяцаў гэтага года ў Літве нарадзілася 23,1 тыс. дзяцей, або на 2 працэнты менш, чым за той жа перыяд мінулага. А памерла на 4,2 тыс. больш, чым нарадзілася.

Чаму літоўскія жанчыны не хочуць нараджаць? Асноўныя прычыны — эканамічнага і сацыяльнага характару. Больш за палову жыхароў Літвы (54,6%) сцвярджаюць, што з цяжкасцю або з крайнімі цяжкасцямі могуць пражыць на даходы, якія маюцца. Пра гэта сведчыць сацыялагічнае даследаванне, праведзенае Інстытутам дзяржаўнага кіравання і палітыкі Каўнаскага тэхналагічнага інстытута. Дзе тут думаць пра павелічэнне сям'і! Недахопу ў сродках не адчуваюць усяго 3,6% рэспандэнтаў.

Абнародаваныя вынікі ўсеагульнага перапісу насельніцтва паказваюць, што ў Літве становіцца менш людзей, якія жывуць у шлюбе. За дзесяць гадоў частка мужчын, якія ніколі не бралі шлюб, узрасла з 28,3% да 32,2%, жанчын — з 21,2% да 23,5%. За дзесяць апошніх гадоў павялічылася колькасць разведзеных, а таксама ўдаўцоў і ўдоў.

Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута дэмаграфічных даследаванняў Аўшра Маслаўскайтэ сказала журналістам, што вынікі перапісу насельніцтва пацвярджаюць змяненні ў мадэлі фарміравання сям'і ў Літве, якія пачаліся з аднаўленнем незалежнасці. «Людзі спачатку ствараюць партнёрства не шляхам прамога шлюбу, а праз пазашлюбнае сумеснае жыццё (каабітацыю). Зразумела, калі мы задаём пытанне пра шлюбны статус, яны трапляюць у групу «якія пражываюць не ў шлюбе», — сказала сацыёлаг.



— Мама, а куды адлятаюць буслы?

Паводле яе слоў, пазашлюбнае сумеснае жыццё нікога не здзіўляе і гэта становіцца нарматыўна прымальным ладам жыцця, моцны сацыяльны ціск грамадзянскага меркавання адсутнічае. Як паказваюць сацыялагічныя даследаванні, 75% усіх партнёрстваў паміж мужчынам і жанчынай у Літве пачынаюцца з каабітацыі, а не са шлюбу. Тых, хто адразу бяруць шлюб, ужо меншасць. Жыццё па-за шлюбам, і як вынік — няўпэўненасць у будучыні такіх стасункаў, на жаль, таксама не спрыяе нараджэнню дзяцей.

Але самае дрэннае, на мой погляд, — гэта згубная палітыка цяперашняга ўрада Літвы. Прэм'ер-міністр, кансерватар Андрус Кубілюс, развіваючы сваю палітыку эканоміі, вырашыў рэзка пагоршыць становішча будучых бацькоў. Былі скарочаны дапамогі па мацярынстве, зменшаны тэрмін «дэкрэтнага» водпуску.

Пачалося і «паляванне на ведзьмаў» — судовы пераслед цяжарных жанчын, якія, на думку ўлад, «правініліся», атрымліваючы вялікія зарплаты перад родамі. Справа ў тым, што ад велічыні зарплаты залежыць велічыня дапамогі па мацярынстве. Кансерватары правялі шэраг судовых працэсаў па ўсёй краіне, пакаралі не адну маладую маму не толькі грашовымі штрафамі, але і тэрмінамі турэмнага зняволення. Мала таго, улады дадумаліся аб'явіць, што гэтыя «несумленныя» жанчыны вінаватыя ў тым, што стала не хапаць грошай для выплат пенсій.

«На працягу некалькі гадоў, пасля таго, як сістэма дапамогі маладым бацькам пачала згортвацца, у Літве рэзка зменшылася нараджальнасць. У той час улады пераконвалі свой народ у тым, што пачаты ў 2009 годзе тэрор сям'і не будзе мець наступстваў. Наіўна было думаць, што «паляванне на ведзьмаў», змяншэнне дапамог па мацярынстве, палітычная нестабільнасць, псіхалагічны ціск, унушэнне пачуцця непаўнавартасці і папраўкі да закона аб мацярынстве, якія абвінавачваюць ледзь не кожны тыдзень, ніяк не паўплываюць на нараджальнасць», — сказаў член Сейма Мечыслаўас Засчырынскас.

Парламентарый мае рацыю: жанчыны Літвы адразу далі зразумець уладам, як яны ацэньваюць сітуацыю, што ўзнікла. І нашы буслы, якія літоўцы выбралі нацыянальным сімвалам, тут зусім ні пры чым.

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,**
**уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве.**
**Фота аўтара.**

*Вільнюс*

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Вы цяпер не вельмі схільныя да дзелавых зносін. Затое будзеце здольныя ацаніць цёплую дамашнюю атмасферу. Важныя справы і сустрэчы лепш перанесці на наступны тыдзень. Паспрабуйце адпачыць ад мітусні і шуму. Пазбягайце кантактаў з сумнійнымі партнёрамі. Варта з галавой акунуцца ў службовую руціну.

**ЦЯЛЕЦ.** На пачатку тыдня захочацца задумаць штосьці новенькае і дамагчыся жаданага самымі экстравагантнымі спосабамі. Толькі не цягніце час, бо другая палова тыдня не спрыяе падобным дзеянням. Зможаце добра ўсвядоміць, што перашкаджае вашаму духоўнаму росту і развіццю, — гэта дазволіць пачаць карэкцыю негатыўных рыс характару.

**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень абяцае быць эмацыянальна насычаным і багатым на падзеі. Вашы жаданні знойдуць падтрымку з боку блізкіх. Неабходна скарыстацца ўдалым перыядам, каб бліснуць сваімі талентамі. Фартуна ўсміхнецца ў самы нечаканы момант, а гэта абяцае выкананне даўніх, ужо амаль забытых жаданняў.

**РАК.** Ваша шматзначнае маўчанне будзе на вагу золата. Калі не прагаворыцеся, то, верагодна, ваша жыццё значна палепшыцца. У першай палове тыдня вас чакаюць цікавыя сустрэчы. Вось тут сакрэты, якія вы старанна захоўваеце, і адкрыюць новыя перспектывы.

**ЛЕЎ.** Тыдзень варта прысвяціць інтэнсіўнай працы. Вас чакае ўвесь спектр службовага ўзаемадзеяння — як з падначаленымі, так і з кіраўніцтвам. Тыдзень будзе насычаны вельмі значнымі падзеямі, як на працы, так і ў сям'і.

**ДЗЕВА.** Тыдзень абяцае быць зусім не сумным і зусім не простым. Магчымыя змены ў лепшы бок у адносінах з дзелавымі партнёрамі, а разумны кампраміс падчас перамоў дазволіць дамагчыся вызначаных мэт. Будзьце асцярожныя пры зносінах з калегамі і начальствам: не ўсе вашы выказванні знойдуць іх адабрэнне, некаторыя могуць унесці рознагалоссі ў жыццё калектыву і стаць прычынай для непаразуменняў.

**ШАЛІ.** Настае спрыяльны час, калі амаль ідэальна падыходзіць для адпачынку. Ні чым іншым вы ўсё адно займацца не ў стане: прачнецца жаданне прыгод і забаў, а не начацца знікне цяга да працы. А для тых прадстаўнікоў знака, у якіх іншыя планы, падзеі будуць развівацца па іншым, крыху менш прывабным сцэнарыі. На пачатку тыдня набярыцеся цярпення, бо калегі па працы і сваякі могуць пачаць тузаць вас па ўсякіх дробязях. У другой палове тыдня цярпенне ўжо не дапаможа: давядзецца тлумачыць, што ўваходзіць у вашы абавязкі, а што ад вас патрабаваць бессэнсоўна, таму што яно пераўзыходзіць межы вашых магчымасцяў.

**СКАРПІЁН.** Вам проста неабходна цвёрда стаяць на зямлі, не лунаць у паднябессі і пазбягаць двухсэнсоўных сітуацый. Скарыстайцеся дапамогай сяброў, блізкіх, калег па працы. Цяпер добры час для павышэння вашага інтэлектуальнага і прафесійнага ўзроўню. Вы з лёгкасцю зможаце наладжваць кантакты з патрэбнымі і цікавымі людзьмі.

**СТРАЛЕЦ.** Ініцыятыўнасць і сабранасць — вось якасці, неабходныя для таго, каб умець кіраваць сітуацыяй. Пажадана не шукаць шчылін, а ісці законнымі шляхамі. Давядзецца вучыцца валодаць сабой, стрымліваць свае эмоцыі — а гэта будзе не так проста. Любое інтэлектуальнае пачынанне ў першай палове тыдня прынясе вам поспех.

**КАЗЯРОГ.** Можаце стаць прыкметнай асобай на працы. Вашы навыкі і досвед будуць карыснымі супрацоўнікам, вы лёгка заваюеце іх прызнанне. У вас ёсць два шляхі: трэба ці вельмі шмат працаваць у самых розных абласцях, каб стаць незаменным, ці не працаваць наогул, каб навакольным давялося вас аб гэтым папрасіць.

**ВАДАЛЕЙ.** Можаце адчуць, што праца не прыносіць задавальнення ў плане ўзнагароды, і вам захочацца правесці некаторае абнаўленне. Вашы мэты будуць здавацца навакольным недасягальнымі, але, сабраўшы ў адзінае цэлае волю і рашучасць, атрымаеце ўражальныя вынікі. Не ўскладайце асаблівых надзей на ўплывовых заступнікаў: яны вам цяпер не памочнікі — разлічваць трэба выключна на ўласныя сілы.

**РЫБЫ.** Высокая працаздольнасць, добрае самаадчуванне і выдатны настрой стануць гарантыяй поспеху ў шматлікіх сферах дзейнасці. Паспрабуйце не абстрагавацца ад калег па працы, бо ў гэтай сітуацыі самым лепшым рашэннем будзе калектыўнае. Аўторак не самы ўдалы дзень, каб нагадаць начальству пра свае дасягненні: вашы намеры могуць няправільна вытлумачыць. У новых справах з партнёрамі па бізнесе ўсе ўмовы агаварыце загадзя цвёрда і максімальна дакладна.


**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ**
**О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**
**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в н.п. Курганье, Алесино, Студенка, Дуброва, Заболотье Курганского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **14 ноября 2012 года, в 15.00, д. Курганье, ул. Центральная, 8, Курганский сельисполком, зал заседаний.** |
| 3 | Продавец и его адрес | Курганский сельский исполнительный комитет, Минская область, Смолевичский район, деревня Курганье, улица Центральная, 8. |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – площадь 0,2074 га, № 624882506601000113, д. Курганье;<br>Лот № 2 – площадь 0,2128 га, № 624882500101000228, аг. Алесино;<br>Лот № 3 – площадь 0,2428 га, № 624882511101000137, д. Студенка;<br>Лот № 4 – площадь 0, 2500 га, № 624882503101000071, д. Дуброва;<br>Лот № 5 – площадь 0,1497 га, № 624882500101000266, аг. Алесино.<br>лот № 6 – площадь 0,2392 га, № 624882504101000052, д. Заболотье |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 – 18 994 689 рублей<br>Лот № 2 – 40 194 900 рублей<br>Лот № 3 –19 263 644 рубля<br>Лот № 4 – 31 066 750 рублей<br>Лот № 5 – 37 324 593 рубля<br>Лот № 6 – 9 561 781 рубль |
| 8 | Условия аукциона | а) продажа по цене не ниже начальной;<br>б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательством Республики Беларусь;<br>в) при подаче заявки на предмет аукциона одним участником земельный участок продается при согласии участника по начальной цене, увеличенной на 5%. |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры и преимущества | д. Курганье – электроснабжение, водоснабжение, асфальтированный подъезд, в перспективе – газоснабжение;<br>аг. Алесино – электроснабжение, водоснабжение, асфальтированный подъезд, газоснабжение, развитая инфраструктура; есть озеро;<br>д. Студенка – электроснабжение, асфальтированный подъезд, в перспективе – газоснабжение;<br>д. Дуброва – электроснабжение, водоснабжение, асфальтированный подъезд, расстояние до г. Смолевичи – 10 км; есть озеро;<br>аг. Алесино – электроснабжение, водоснабжение, асфальтированный подъезд, газоснабжение, развитая инфраструктура; есть озеро, центр агрогородка;<br>д. Заболотье – электроснабжение, грунтовая дорога; богатые лесные угодья. |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона. |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3641000000045 филиал 616 АСБ «Беларусбанк» ЦБУ 621 г. Смолевичи, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»). |
| 12 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждый вторник в 10.00. |
| 13 | Окончательный срок приема документов | 08 ноября 2012 года в 17.00. |
| 14 | Контактные телефоны | 8-01776-46-2-36; 46-2-46; 46-2-37; моб. 189-63-60 (вел.) |

Расходы по организации и проведению аукциона (в т.ч. за изготовление документации), затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка (10% от кадастровой стоимости земельного участка) на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).



**Отмечая 90-летие, «Беларусбанк» предлагает своим клиентам новый вклад «Юбилейный-90!»**

Фиксированная доходность в размере ставки рефинансирования на день открытия вклада.

90 вкладчиков – победителей рекламной игры – получат право дальнейшего хранения средств сроком на 90 дней с начислением повышенного дохода, который на 90 % превышает размер ставки рефинансирования, действующей на 26.12.2012 г.

Вкладчикам, выполнившим определенные условия, дополнительно предлагается:

- бонусная программа по пластиковым карточкам премиального класса;
- льготная ставка при оформлении потребительского кредита до конца 2013 года.

**Спешите! Прием средств осуществляется с 10 октября по 20 ноября 2012 года.**

Храните белорусские рубли в «Беларусбанке»!

Подробности – в отделениях и на сайте банка, а также по номеру **147.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*


■ Крымінал, здарэнні

## КІНУЎ АЎТАМАБІЛЬ І НА ЎЦЁКІ

**Вадзіцель збіў на пешаходным пераходзе 13-гадовую дзяўчынку і збег з месца здарэння.**

Жыхар вёскі Буйнічы Магілёўскага раёна, якому 28 гадоў, насуперак закону сеў за руль аўтамабіля «Фольксваген Гольф». ДАІ характарызуе яго як злоснага парушальніка: летась ён 18 разоў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў дарожнага руху, а ў сёлетнім студзені пазбавіўся правоў за нецвярозае ваджэнне.

Аднак гэта мужчыну не спыніла: у абласным цэнтры ён збіў дзяўчынку на нерэгулюемым пешаходным пераходзе. З закрытай чэрапна-мазгавой траўмай, страсеннем галаўнога мозга і ўдарамі яе шпіталізавалі.

— Вадзіцель збег з месца здарэння, кінуўшы свой аўтамабіль, — паведаміла інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе Магілёўскай ДАІ Вольга Вяршубская. — Яго знайшлі і затрымалі праз паўгадзіны. Віноўнік аварыі будзе несці адказнасць за ўсё, што нарабіў.

**Ілона ІВАНОВА.**

## КІРОЎЦА ПАД «КАЙФАМ» НЕ ЗАЎВАЖЫЎ ТРАЛЕЙБУС

**Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ўвечары ў сталіцы па вуліцы Ангарскай: 31-гадовы вадзіцель іншамаркі не справіўся з кіраваннем, у выніку чаго аўтамабіль сутыкнуўся з тралейбусам, які стаяў каля прыпыначнага пункта і вёў пасадку-высадку пасажыраў.**

— Медыцынскі агляд паказаў, што кіроўца знаходзіўся ў стане наркатычнага ап'янення. Ды ён і сам не адмаўляў таго, — расказалі ў аддзеле ДАІ Заводскага РУУС г. Мінска. — Высветлілася таксама, што мужчына вадзіцельскага пасведчання ніколі не атрымліваў, а раней быў судзімы за крымінальнае злачынства. На шчасце, ніхто не пацярпеў. Па факце здарэння праводзіцца праверка.

## СТРАЛА КРАНА ЗАЧАПІЛА ПРАВАДЫ...

**У выніку няшчаснага выпадку жыхар Ваўкавыска атрымаў смяротнае пашкоджанне электрычным токам.**

Паблізу дома, які будаваўся па вуліцы Слонімскай, аўтакранам праводзіліся пагрузачна-разгрузачныя работы з грузавіка, паведамілі падрабязнасці здарэння ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. Падчас гэтага працэсу пры пад'ёме стралы крана была закранута лінія электраперадач 110 кВ. У выніку адбылося смяротнае пашкоджанне электратокам 27-гадовага ўладальніка жылога дома, які стаяў на зямлі: у 21.20 брыгада хуткай медыцынскай дапамогі даставіла яго ў прыёмнае аддзяленне Ваўкавыскай цэнтральнай раённай бальніцы без прыкмет жыцця... Кіроўца крана не пацярпеў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## ЦЫГАРЭТЫ Ў... ЗАПАСНЫМ КОЛЕ



Фота Гродзенскай пагранічнай групы.

Гродзенскія памежнікі ў пункце пропуску «Прывалка» сумесна з мытнікамі затрымалі ўначы васьмярых мясцовых жыхароў, якія спрабавалі перавезці ў тайніках сваіх аўтамабіляў 60 каробак цыгарэт з беларускімі акцызнымі маркамі.

Для незаконнага перамяшчэння тытунёвых вырабаў праз беларуска-літоўскую мяжу выкарыстоўваліся не толькі канструкцыйныя асаблівасці машын, але і спецыяльныя тайнікі. Кантрабанда хавалася ў металічнай ёмістасці, якая была прыварана да днішча аўтамабіля, у газавым балоне, у пустацелай прасторы запаснога кола і ў іншых месцах. Увогуле ў васьмі легкавіках «перамяшчалася» каля 30 тысяч пачкаў цыгарэт розных марак агульным коштам, паводле папярэдняй ацэнкі, прыкладна 100 мільёнаў рублёў.

Цыгарэты перададзены ў рэгіянальную мытню, а аўтамабілі, у якіх незаконна перавозіўся падакцызны тавар, затрыманы да рашэння суда, паведаміў прэс-сакратар Гродзенскай пагранічнай групы, падпалкоўнік Сяргей Шумейка.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


***Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»!***

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**ОАО «Белгорхимпром»**
**СОСТОИТСЯ 19 октября 2012 года в 11.00**
**по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале.**

УНП 600024712

**Повестка дня:**

1. О внесении изменений в Положение «О порядке направления в служебные командировки за границу».
2. Определение размера вознаграждения члену наблюдательного совета.

Регистрация акционеров — в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж).



Иностранное общество с ограниченной ответственностью «МИАТОН» настоящим сообщает о своей реорганизации путем выделения из ИООО «МИАТОН» нового юридического лица — Общества с ограниченной ответственностью «Сильвер Тауэр».
Реорганизация проведена на основании решения внеочередного общего собрания участников от 11 сентября 2012 г. (протокол № 4).

В связи с проведенной реорганизацией уменьшен уставный фонд ИООО «МИАТОН».

Требования кредиторов удовлетворяются в течение 1 месяца с момента публикации настоящего уведомления по адресу: 220036, г. Минск, пр. Дзержинского, 5, офис 413, тел./факс (017) 328 15 70. УНН 100799264



# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

**2-я очередь строительства 2-й пусковой комплекс**
**Жилой дом № 2 (по генплану), 3 секции в осях 5-8**
**комплекса жилой застройки неповышенной комфортности в квартале улиц Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая в г. Минске**

Совместное общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНТЕ-РОБА» информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.

**Информация о Застройщике**

Застройщик (Заказчик) – СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА». Зарегистрировано решением № 653 Минского городского исполнительного комитета от 31.03.2004 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190527399. Место нахождения (юридический адрес) застройщика: 220125, г. Минск, ул. Городецкая, д. 22, помещение 397, телефон: 269-32-60.

Режим работы: понедельник – пятница: с 8.30 до 17.30, обед: 13.30-14.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА» с 2009 г. по 2011 г. были сданы в эксплуатацию многоквартирные жилые дома в г. Минске: по ул. Волгоградской, дом № 64; по ул. Волгоградской, дом № 34; по пр-ту Машерова, дом № 43; по ул. Городецкой, дом № 22 (1-я очередь строительства 1-й пусковой комплекс, 2-й пусковой комплекс).

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 12 ноября 2009 г. № 541 «О реализации отдельных инвестиционных проектов в г. Минске» и инвестиционным договором от 14 июня 2011 г. № 17, зарегистрированным в Государственном реестре инвестиционных договоров с Республикой Беларусь 20 июня 2011 г., регистрационный № ИД-665, застройщик осуществляет реализацию инвестиционного проекта по строительству объекта «Комплекс жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянская-Гинтовта-Ложинская-Городецкая в г. Минске».

**Информация об объекте долевого строительства**

Цель строительства – выполнение инвестиционного проекта «Комплекс жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул.Шафарнянской – Гинтовта – Ложинской – Городецкой в г. Минске».

Комплекс состоит из 2-х индивидуальных жилых зданий секционного типа различной этажности, 5-этажного здания торгово-административного центра, гаража-стоянки, зданий технического назначения.

**Объект долевого строительства** – 2-й пусковой комплекс 2-й очереди строительства – 3 секции в осях «8»-«5» (12-14 этажей (включая цокольный этаж) жилого дома № 2 по генплану) на 121 квартиру с техническими и административными помещениями в цокольном этаже.

Объект долевого строительства расположен на территории Первомайского района г. Минска, в пределах улиц Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая».

Начало строительства – ноябрь 2012 г.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – февраль 2014 г.

Площадь жилого здания – 10960,0 кв.м.

Общая площадь квартир (проектная) – 8820,0 кв.м;

Общая площадь административных помещений – 480,38 м.кв.

Для привлечения физических и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагается 121 квартира – стоимостью за 1 кв.м в белорусских рублях в сумме, эквивалентной 2200 долл. США, а также административные помещения стоимостью за 1 кв.м в белорусских рублях в сумме, эквивалентной 2500 долл. США. Предусмотрена система скидок.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические помещения, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков

Конструктивная схема жилого дома – монолитный каркас с монолитными диафрагмами жесткости и монолитными перекрытиями, наружные стены – кладка из блоков ячеистого бетона по СТБ 1117-98 и поэтажным опиранием на диски перекрытий.

Принятая конструктивная схема дает возможность максимальной свободы при перепланировке помещений квартир под индивидуальные потребности покупателя (т.н. «свободная планировка»).

Здание 2-го пускового комплекса жилого дома № 2 – 3-секционное, 12-14-этажное (включая цокольный этаж), 121-квартирное, без чердака. Высота этажа 3,0 м, высота верхнего этажа каждой секции 3,3 м. Верхний этаж выполнен с квартирами увеличенной площади с панорамным остеклением по главному фасаду.

Секции оборудованы каждая двумя лифтами (грузоподъемностью 630 кг и грузоподъемностью 400 кг). В каждой квартире предусмотрены летние помещения.

Наружная отделка – штукатурка с последующей покраской фасадной краской. Антивандальная облицовка нижних этажей главного фасада мозаичной штукатуркой.

Внутренняя отделка:

Стены в помещениях общего пользования – декоративная штукатурка с последующей окраской акриловыми красками, керамическая плитка.

Полы в помещениях общего пользования – покрытие из плитки «Гресс», линолеум.

Полы в тамбурах – с антискользящим покрытием.

Потолки (в помещениях общего пользования) – акриловая покраска, зашивка из гипсокартона с последующей акриловой покраской в местах прохода коммуникаций.

Квартиры и административные помещения запроектированы без отделки и покрытия полов.

Двери – деревянные усиленные, деревянные (масляная покраска), из профиля ПВХ (в административных помещениях).

Система отопления запроектирована двухтрубная поквартирная с установкой узлов учета тепла для каждой квартиры.

Вентиляция жилого дома предусмотрена естественная, во встроенных помещениях цокольного этажа – приточно-вытяжная.

Источник водоснабжения – наружная сеть водопровода высокого давления. Для учета холодной и горячей воды в каждой квартире предусматривается установка счетчиков.

Проектом предусмотрен комплекс мероприятий по обеспечению пожарной безопасности здания, в т.ч. обеспечение эвакуации людей в лестничные клетки типа Н1, устройство вторых выходов из квартир в лоджии с глухими простенками.

**Застройщиком получены:**

- акт выбора места размещения земельного участка для строительства объекта «Комплекс жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянской – Гинтовта – Ложинской – Городецкой» от 26.08.2008 г., утвержденный Председателем Минского городского исполнительного комитета 01.09.2008 г.;
- решение Минского городского исполнительного комитета № 3845/1 от 22.12.2011 г.;
- свидетельство (удостоверение) № 500/1001-571 о государственной регистрации создания земельного участка на основании выделения вновь образованного земельного участка, правообладатель – Республика Беларусь (право собственности); возникновения прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок (право временного пользования), правообладатель – юридическое лицо, резидент Республики Беларусь СООО «Белинте-Роба»;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, экспертное заключение РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА» № 558-15/12 от 15.08.2012 г.;
- выданное 27.12.2011 г. органом государственного строительного надзора разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-206Ж-013/11;
- договор генерального строительного подряда № 01-12/ ШГ-2-2011 от 01.12.2011 г., заключенный с ИООО «ДАНА АСТРА».

С планировками квартир, административных помещений и ходом работ по строительству можно ознакомиться в мобильном офисе компании, расположенном на территории застройки около Национальной библиотеки.

**Дополнительную информацию можно получить по телефонам: 8-029-5-000-840 (841, 843, 844, 877), 8-044-768-81-13 (14), 8-044-746-18-96.**

